

ЗАХОПЛЕНЫ... ДЫНАЗАЎРАМІ

ЧЫРВОНКА

СЭРВІС АД СТУДЭНТАЎ – НА ЎЗРОЎНІ!

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 МАЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 87 (29201)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вольга МЫЧКО, генеральны сакратар Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа:**

*«9 Мая — дата, якая дапамагае аб'ядноўвацца і рабіць добрыя справы. Яна дарагая кожнаму беларусу. Ускладанне вянкоў да мемарыялаў трэба не мёртвым, гэта неабходна жывым як даніна памяці загінулым героям і паважаным ветэранам».*

## КОРАТКА

- **Пачатак парада да Дня Перамогі запланаваны на 11.00.**
- На рэспубліканскім суботніку зароблена больш за Br9,1 млн.
- **Банкі выдзелілі на дапамогу медыкам у барацьбе з каранавірусам больш за Br2,2 млн.**
- Электронная бібліятэка БДУ захавала статус лідара ўніверсітэцкіх рэпазіторыяў Еўропы.
- **Фотаальбом «Рарытэты ваенна-гістарычных музеяў Беларусі і Расіі» прэзентаваны ў Мінску.**



- Прэм'ер-міністры краін Балтыі дамовіліся пра адкрыццё граніц.
- **Зязюлі, чорныя стрыжы і берагавыя ластаўкі вярнуліся ў Беларусь пасля зімоўкі.**
- Яблыневыя сады ў Пастаўскім раёне выкупіў бізнесмен з Францыі.
- **Пяць найноўшых танкаў Т-72Б3 паступілі ва Узброеныя Сілы Беларусі.**
- Рэспубліканскія спаборніцтвы па лоўлі рыбы пераносяцца.

ISSN 1990 - 763X

20087

9 771990 763008

# БУЙНЫМ ПЛАНАМ






Нягледзячы на дождж, які зарадзіў з раніцы, учора працягвалася падрыхтоўка сталіцы да парада, які пройдзе на скрыжаванні праспектаў Пераможцаў і Машэрава.

*На здымку:* ідзе мантаж вялікага экрана, на якім буйным планам будуць транслявацца галоўныя падзеі святочнага шэсця.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Салдаты Перамогі

## Малітвамі бацькоў, хроснай маці і франтавой удачай

**Хрэснік сям'і Рыгора Шырмы, сын пружанскага святара прайшоў вайну пехацінцам**

**Гады свае ён прывык лічыць дакладна. «Мне 94 гады, 1 месяц і 20 дзён», — усміхаецца Вадзім Рыгоравіч. — І 75-я Перамога. Медаль юбілейны мне ўжо прывезлі з ваенкамата, уручылі. Ну а на свята будуць званіць унукі, вядома, віншаваць». Ветэран Вялікай Айчыннай Вадзім Рыгоравіч Сіняк жыве ў Каменюках, што ў Белавежскай пушчы. Цяпер да бацькі перабралася дачка Лілія з Мінска.**

СТАР. 13



Праведаць ветэрана прыйшоў старшыня Камянюцкага сельскага Савета Сяргей БАГАЛЕЙША.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Жыві і квітней, Беларусь! Абеліскі параненай зямлі. Адраджэнне

## Па кім звоняць званы Хатыні?

На Беларусі хіба што зусім малыя дзеці не чулі пра яе. Але ці змаглі мы ўлавіць усе тыя сэнсы, пра якія апавядае гэты мемарыял?



Фота БелТА.

**«Важна захоўваць для будучых пакаленняў памяць не толькі аб салдатах і партызанах — іх подзвіг святы і не падлягае сумненню. У першую чаргу важна гаварыць пра тое, што вайна была сусветным злом, якое нацэлена на ні ў чым не вінаватых людзей. І Хатынь — гэта помнік, прысвечаны не толькі адной ці ўсім спаленым вёскам, як гэта часта падаецца. Гэта мемарыял мірным жыхарам Беларусі незалежна ад іх нацыянальнасці і веравызнання: беларусам, рускім, яўрэям, палякам, татарам. Глабалізм Хатыні часта выпадае з-пад увагі», — не перастае паўтараць дырэктар Дзяржаўнага мемарыяльнага комплекса «Хатынь» Артур ЗЕЛЬСКІ. Званы звоняць пра трагедыю цэлага пакалення, пра жахлівую катастрофу XX стагоддзя.**

СТАР. 4

Парламенцкі дзённік

# Вызваленым па амністыі будзе аказана дапамога

**Падчас чарговага пасяджэння другой сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу быў разгледжаны адразу ў двух чытаннях законапраект «Аб амністыі ў сувязі з 75-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў». Асабліва актыўна дэпутаты абмяркоўвалі пытанні амністыі непаўналетніх асуджаных па артыкуле 328 Крымінальнага кодэкса.**

«Я шмат гадоў аддаў барацьбе са злачыннасцю і выдатна памятаю часы, калі мы працавалі да дэкрэта Прэзідэнта аб узмацненні жорсткасці мер па барацьбе з наркаманіяй. Выязджаў на месцы здарэнняў як начальнік міліцыі, і тады нам маці задавалі пытанні, маўляў, чаму мы нічога не робім? Я лічу, што ўзмацненне адказнасці за распаўсюджванне наркотыкаў выратавала вялікую колькасць падлеткаў. Мы былі заклапочаны, ці не паўплывае своеасаблівае змякчэнне ў гэтай сферы на барацьбу ў адпаведным кірунку, на агульны ўзровень злачыннасці, — растлумачыў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ГАЙДУКЕВІЧ.** — Прыйшлі да высновы, што не, амністыя — гэта праяўленне гуманізму з боку дзяржавы, і яна будзе на карысць».

За аснову законапраекта была ўзятая структура папярэдняга закона аб амністыі, але многія палажэнні актуалізаваныя і перапрацаваныя з улікам практыкі яго прымянення, аналізу судовай статыстыкі, інфармацыі Міністэрства ўнутраных спраў і Генеральнай пракуратуры.

— Новае ў гэтым законе тое, што сёлета пад амністыю трапляюць непаўналетнія, якія здзейснілі злачынствы, прадугледжаныя часткамі 4 і 5 артыкула 328 Крымінальнага кодэкса — за незаконны абарот наркотыкаў, — дадала **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ.** — Таксама пад амністыю трапяць асуджаныя па карупцыйных злачынствах, безумоўна, толькі пры кампенсацыі шкоды. Традыцыйна пад дзеянне гэтага закона трапяць ільготныя катэгорыі грамадзян: непаўналетнія, цяжарныя жанчыны, адзінокія жанчыны ці мужчыны, якія выхоўваюць дзяцей да 18 гадоў, асобы, якія хварэюць на анкалогію, і іншыя.

Тэрмін выканання новага закона — шэсць месяцаў. Летась тэрмін выканання закона аб амністыі складаў дзевяць месяцаў. Пад амністыю не трапляюць асобы, якія здзейснілі асабліва цяжкія злачынствы і некаторыя злачынствы з катэгорыі менш цяжкіх.

«Закон аб амністыі — унікальны нарматыўна-прававы акт, — расказала **старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ.** — Ён сам па сабе не адмяняе прызначанага пакарання, ён не ставіць пад сумненне законнасць, абгрунтаванасць і справядлівасць прысуду. Гэта шанц для асуджаных аднавіць нармальнае жыццё і весці законапаслухмяны лад жыцця. Сёння актуальны запыт грамадства на ўзаемадзеянне з уладай. Да нас паступіла некалькі дзясяткаў зваротаў ад бацькоў тых, хто асуджаны па артыкуле 328, і гэты законапраект — пасыл людзям, што мы іх чуем».

Мяркуецца, што з нагоды свята па амністыі будзе вызвалена больш за пяць тысяч асуджаных. Аказанне дапамогі гэтым людзям у бытавым і працоўным уладкаванні прадугледжана законапраектам.

«МУС працуе над гэтым ва ўзаемадзеянні з Мінпрацы і мясцовымі ўладамі, — запэўніў **міністр унутраных спраў Юрый КАРАЕЎ.** — У адносінах да кожнага вызваленага накіроўваецца інфармацыя па месцы жыхарства для аказання пэўнай дапамогі».

Што датычыцца дзяцей і падлеткаў, якія ўчынілі злачынствы па артыкуле 328 Крымінальнага кодэкса, дык іх на самай справе няшмат. Таму іх доля сярод тых, каго амніснцыруюць, невялікая. «Да ўсіх падышлі пачалавечы, па справядлівасці. Усіх, каго толькі можна было, мы не выключылі з гэтага працэсу, ніхто не забыты», — дадаў міністр.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Ваша права

# ЮРЫДЫЧНЫЯ КАНСУЛЬТАЦЫІ ДА 75-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ

**Адбудуцца ў фармаце прамых тэлефонных ліній 8 мая з 11 да 13 гадзін. У гэты час грамадзяне змогуць дыстанцыйна атрымаць адказы на шырокі спектр прававых пытанняў — ад змены прозвішча і спагнання аліментаў з-за мяжы да стварэння ўласнага бізнесу і супрацоўніцтва з рыэлтарамі. Бясплатная акцыя пройдзе па ўсёй краіне, і ўдзел у ёй возьмуць спецыялісты Міністэрства юстыцыі, адвакаты і натарыусы.**

*— Мы максімальна пашырылі пералік прававых пытанняў, што найбольш цікавяць людзей, падабралі вопытных спецыялістаў, якія дасканала ў іх разбіраюцца, і павялічылі час прамых тэлефонных ліній да дзвюх гадзін. Акрамя таго, да знакавай даты 75-годдзя Перамогі мы знялі ўсе абмежаванні. Каб атрымаць кансультацыю, не трэба быць ветэранам: прававую дапамогу акажуць абсалютна ўсім, хто звернецца,* — расказала **Вольга ШЫБКО, прэс-сакратар Міністэрства юстыцыі.** *— Кансультацыі адбудуцца дыстанцыйна, бясплатна і мабільна. На сайце Міністэрства юстыцыі https://minjust.gov.by/ прадстаўлены поўны спіс тэм і кантакты 17 спецыялістаў, адказных за пэўныя галіны права. Перш чым звяртацца са сваёй праблемай, лепш прагледзець гэты пералік і выбраць адпаведнага эксперта.*

Натарыусы адкажуць на пытанні, якія датычацца адчужэння нерухомасці, афармлення спадчыны, складання завяшчанняў, дагавораў дарэння, засведчання даверанасцяў, здзяйснення выканаўчых надпісаў, падачы электронных дакументаў для дзяржрэгістрацыі юрыдычных асоб або індывідуальных прадпрымальнікаў ці ўнясення змен у статут (устаноўчы дагавор) натарыусам, забеспячэнне пісьмовых доказаў.

*— Бясплатныя кансультацыі 8 мая адбудуцца ва ўсіх натарыяльных канторах і бюро краіны, куды можна як прыйсці, так і звярнуцца па тэлефоне ці з дапамогай месенджара. Узгадніць найбольш зручны фармат стасункаў, у тым ліку праз відэасувязь, таксама можна па тэлефоне,* — удакладніў **Артур СТРЭХ, памочнік старшыні Беларускай натарыяльнай палаты.** *— З 11 мая да канца месяца бясплатныя кансультацыі будуць праходзіць толькі аддалена: па тэлефоне, праз «Скайп», «Вайбер» і іншыя сродкі камунікацыі. Графікі можна ўбачыць на сайце БНП https://belnotary.by/.*

Спецыяліст падкрэсліў, што дыстанцыйная кансультацыя з'яўляецца папярэдняй, бо наконт некаторых праваадносін поўная кансультацыя магчыма толькі пасля ацэнкі натарыусам усіх абставін і неабходных дакументаў.

Фінансы

# Другасны рынак жылля застаўся без крэдытаў?

**З першых дзён мая Беларусбанк прыпыніў выдачу крэдытаў на куплю жылля, захаваўшы толькі падтрымку першаснага будаўніцтва за кошт крэдытнай праграмы з забудоўшчыкамі-партнёрамі.**

Праўда, яшчэ месяц таму некаторыя беларускія банкі пачалі паступова згортваць крэдытаванне нерухомасці як на першасным, так і на другасным рынках. Калі ў пачатку красавіка крэдыт на куплю жылля можна было ўзяць у сямі банках, то ў канцы месяца — у пяці. А ў пачатку гэтага месяца стала вядома, што крэдытаванне для насельніцтва «абмяжоўваецца» новымі ўмовамі і ў найбуйнейшым банку краіны.

Цяпер банк істотна змяніў умовы крэдытавання нерухомасці. Сёння працэнтная стаўка па крэдыце складае 14,09 % гадавых. Але гэта далёка не ўсё.

Адначасова фінансавая ўстанова паведамляе, што банк прыпыняе прыём новых крэдытных заявак на набыццё жылых памяшканняў на другасным рынку, а таксама куплю домакамплектаў і незавершаных закансерваваных капітальных будынкаў.

Разам з тым прэс-служба Беларусбанка звяртае нашу ўвагу на тое, што фінансісты працягваюць крэдытаваць набыццё і будаўніцтва кватэр у забудоўшчыкаў у рамках партнёрскай праграмы «Іпатэка з намі». Сёння банк супрацоўнічае з 22 будаўнічымі кампаніямі па ўсёй краіне, і з імі распрацаваны індывідуальныя крэдытныя прадукты.

Акрамя таго, застаюцца нязменнымі ўмовы крэдытавання будаўніцтва і набыцця жылля з субсідзіраваннем у рамках Указа № 240 і сістэмы будаўнічых зберажэнняў.

Таксама прыпынены прыём крэдытных заявак на рэфінансаванне буйных пакупак «Удалае абнаўленне», на куплю новых аўтамабіляў (акрамя крэдытаў на набыццё аўтамабіляў Geely ў рамках праграмы з СЗАТ «БелДжы»), на атрыманне спажывецкага крэдыту з выкарыстаннем крэдытнай карткі ў рамках заключаных дагавораў аб супрацоўніцтве з арганізацыямі гандлю і сэрвісу.

Банк захаваў магчымасць афармлення ў аддзяленнях крэдытаў на аплату навучання, на куплю тавараў беларускіх вытворцаў праграмы «Партнёр аптымальны». Афармленне іншых крэдытаў на спажывецкія патрэбы ажыццяўляецца праз каналы дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання: сістэмы «М-банкінг», «Інтэрнэт-банкінг», кантакт-цэнтр, карпаратыўны вэб-сайт і інфакіёскі банка.

І трошкі добрых навін. Усе заяўкі на крэдыт, якія паступілі да 1 мая, будуць разгледжаны на ўстаноўленым парадку на ранейшых умовах.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Ядзернае паліва прыбыло на Беларускую АЭС

**Партыя цеплавыдзяляльных зборак (ЦВЗ) з нізкаабагачаным уранам для пачатковай загрузкі ў рэактар даста ўлена на атамную станцыю і рыхтуецца да разгрузкі і правядзення ўваходнага кантролю.**

*— Завоз свежага ядзернага паліва — знакавая з'ява на этапе будаўніцтва кожнага атамнага аб'екта, тым больш для Беларусі, якая зрабіла гэта ўпершыню, —* заўважыў **Віталь ПАЛЯНІН, віцэ-прэзідэнт інжынірынгавай кампаніі «АСЭ», кіраўнік праекта стварэння Беларускай АЭС.** *— Па сутнасці, гэта момант зваротнага адліку да ўводу блока ў эксплуатацыю.*

Беларуская АЭС сумесна з Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях і Дзяржатамнаглядам правяла каласальную работу па забеспячэнні абавязковых умоў для завозу паліва. Уведзены ў эксплуатацыю неабходныя аб'екты, сістэмы і абсталяванне, якія забяспечваюць прыёмку ядзернага паліва і яго бяспечнае захоўванне, у тым ліку аб'екты супрацьаварыйнай гатоўнасці і фізічнай абароны блока.

**Ірына СІДАРОК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Еўрасаюз накрые рэцэсія «гістарычнага маштабу»



Еўракамісія заявіла, што ЕС чакае беспрэцэдэнтная эканамічная рэцэсія — мяркуецца, што сукупны ВУП краін — членаў супольнасці паменшыцца больш чым на сем працэнтаў. Паводле першых ацэнак, калі каранцінныя меры былі абвешчаны ў Германіі, Францыі, Італіі, Іспаніі ды іншых краінах, ЕК меркавала, што вытворчасць тавараў і паслуг упадзе ў найгоршым выпадку на 2,5 працэнта, але гэтыя звесткі былі неафіцыйныя. Пазней адпаведныя лічбы шматкроць перагледзіліся ў бок павелічэння, але таксама неафіцыйна. Учора Еўракамісія апублікавала першы афіцыйны прагноз наконт таго, што чакае эканоміку аб'яднанай Еўропы ў наступныя месяцы. Еўракамісар па эканоміцы Паола Джэнцілоні адзначыў, што аднаўленне пачнецца толькі налета, але, як было падкрэслена, «яно не дазволіць кампенсаваць спад».

## Прыбытак Total абваліўся на 99 працэнтаў

Пандэмія каранавіруса, якая стала адной з прычын абвалу цэн на нафту, прывяла да рэзкага пагаршэння фінансавых паказчыкаў энергетычных кампаній. Так, чысты прыбытак французскай Total, адной з найбуйнейшых нафтагазавых карпарацый у свеце, абваліўся ў першым квартале на 99 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года — да 34 мільёнаў долараў з трох мільярдаў. Не нашмат лепшыя справы і ў канкурэнтаў: раней свае несуцяшальныя справаздачы апублікавалі брытанская BP і брытана-нідэрландская Royal Dutch Shell. Іспанская Repsol паведаміла, што пасля падзення цэн на нафту і зніжэння попыту ў першым квартале панесла страты ў памеры 487 мільёнаў еўра. Летась за гэты перыяд кампанія зарабіла больш за 600 мільёнаў. З-за непрадбачаных абставін нафтавыя гіганты вымушаны мяняць свае планы. Total ужо абвясціла, што на чвэрць знізіць інвестыцыйную праграму на гэты год — з 18 мільярдаў долараў да 14.




## Том Круз будзе здымацца ў космасе



Галівудскі акцёр Том Круз вядзе перамовы з Нацыянальным упраўленнем па аэранаўтыцы і даследаванні касмічнай прасторы наконт здымак фільма ў космасе. Пра гэта паведаміла The Guardian са спасылкай на кіраўніка НАСА Джыма Брайдэнстайна. Сам Брайдэнстайн напісаў у сваім «Твітэры», што ў НАСА вельмі натхніліся перспектывай папрацаваць з Крузам над фільмам на борце Міжнароднай касмічнай станцыі. Як адзначае The Guardian, кіраўнік НАСА не прывёў іншых падрабязнасцяў, але на яго твіт адказаў заснавальнік Tesla і SpaceX Ілан Маск, які напісаў, што «гэта будзе вельмі крута». Адзначаецца, што гаворка не ідзе пра чарговы праект франшызы «Місія невыканальная», хоць жанр новага фільма і вызначылі як «прыгодніцкі экшан». Шматабзацныя праект знаходзіцца на ранняй стадыі распрацоўкі і пакуль што не мае студыі.

Прыёмная кампанія — 2020

# «РЭПЕТЫЦЫЯ» ЦТ У ФАРМАЦЕ «АНЛАЙН»

**Трэці этап рэпетыцыйнага тэсціравання (РТ) можна будзе прайсці на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў анлайн.**

Як вядома, менавіта апошні этап рэпетыцыйнага тэсціравання аказваецца самым масавым, бо некаторыя абітурыенты адкладваюць магчымасць адрэпеціраваць будучы экзамен на апошні момант. Уся школьная праграма на гэты момант ужо пройдзена, да таго ж і тэсты на трэцім этапе адпавядаюць зацверджанай на бягучы год спецыфікацыі, якая ўключае тыпы заданняў, іх колькасць, узроўні складанасці і структуру тэста. Ва ўсе папярэднія гады рэпетыцыйнае тэсціраванне праходзіла ў краіне ў сакавіку-красавіку, але сёлета свае карэкціроўкі ў гэты расклад унесла эпідэмія каранавіруснай інфекцыі. Спачатку было аб'яўлена, што трэці этап пераносіцца на май, але днямі стала вядома, што многія пункты правядзення рэпетыцыйнага тэсціравання зноў адмянілі запланаваныя раней на май сеансы РТ.



«Таму з 19 мая ўсім ахвотным будзе дадзена магчымасць узяць удзел у трэцім этапе рэпетыцыйнага тэсціравання ў электронным фармаце ў анлайн-рэжыме на сайце РІКВ», — праінфармавалі ў інстытуце.

Для ўдзелу ў анлайн-тэсціраванні абітурыентам будзе неабходна, як і раней, зарэгістравацца ў сваім асабістым кабінеце на сайце РІКВ. Пры рэгістрацыі можна будзе скарыстацца адной ці некалькімі свабоднымі аплатамі, якія былі вернутыя пры адмене раней запланаваных сеансаў рэпетыцыйнага тэсціравання, ці зрабіць аплату праз сістэму «Разлік» (АРІП).

Калі абітурыент рэгіструецца для праходжання рэпетыцыйнага тэсціравання ўпершыню, ён павінен стварыць свой асабісты кабінет удзельніка рэпетыцыйнага тэсціравання на сайце РІКВ, выкарыстоўваючы ўкладку «РТ, on-line рэгістрацыя», у ім зрабіць заяўку на ўдзел у сеансе (сеансах) рэпетыцыйнага тэсціравання, аплаціць удзел, выкарыстоўваючы нумар рахунку, прысвоены ўдзельніку ў момант стварэння асабістага кабінета на сайце РІКВ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Экалогія

# Яноты Лімон, Ківі і Ажына

## ратуюць свет ад смецця ў новым мультсерыяле

**Прэм'ера першага айчыннага мульціка «Каманда 99» адбылася на канале Youtube: target99 Belarus. Гэта сапраўдны экалагічны дэтэктыў, у васьмі серыях якога адважныя супергерoі-яноты будуць змагацца з монстрамі, што ўтвараюцца праз няправільную сарціроўку і ўтылізацыю смецця.**



Жоўты янот Лімон сімвалізуе сабой пластыкавыя адкіды, зялёны колер янота Ківі акцэнтуе ўвагу на папяровым смецці, а блакітная дзяўчынка-янот Ажына ўвасабляе сабой адходы шкла. А разам яны — «Каманда 99», якая штодня ратуе нашу планету ад смецця.

Мульцік створаны гомельскай анімацыйнай студыяй па заказе дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» у рамках праекта «Рух «Мэта 99», мэта якога — давесці збор другасных матэрыяльных рэсурсаў да 99 працэнтаў.

Назіраць за прыгодамі маленькіх герояў дзецям лепш разам з бацькамі. Вясёлыя яноты-сарціроўшчыкі абсалютна ўсіх навучаць, што рабіць з рэчамі, якія многія дагэтуль лічаць смеццем.

*— Мы верым, што калі навучым дзяцей правілам сарціроўкі смецця і беражліваму стаўленню да прыродных рэсурсаў, то зможам палепшыць экалагічную сітуацыю ў Беларусі,* — упэўнена **Ніна КУЛЬБЕДА, галоўны спецыяліст па інфармацыйнай рабоце дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** *— Бацькі з маленства вучаць дзяцей мыцца, чысціць зубы, мыць рукі перад ядой і пасля наведвання вуліцы. А задача мультфільма — дапамагчы бацькам выхаваць у малых яшчэ некалькі карысных звычак, неабходных для будучыні.*

**Ірына СІДАРОК.**

Будзь у курсе!

# СПАБОРНІЦТВА ДЛЯ «ЭКАЛАГІЧНЫХ» ФЕРМЕРАЎ

**Стартаваў экалагічны конкурс для фермераў з прызавым фондам у адну тысячу еўра.**

Ён праводзіцца ў Беларусі трэці раз пры падтрымцы Цэнтра экалагічных рашэнняў і кааліцыі «Чыстая Балтыка». Ідэя належыць Сусветнаму фонду дзікай прыроды (WWF).

Каб стаць удзельнікам, трэба да 17 мая падаць заяўку, суправадзіўшы яе аповедам пра тое, якія экалагічныя практыкі выкарыстоўваюцца пры вядзенні сельскай гаспадаркі і як зніжаецца нагрузка на навакольнае асяроддзе.

З аднаго боку, арганізатары хацелі б заахвоціць вытворцаў, якія імкнуцца зніжаць сваю нагрузку на навакольнае асяроддзе, з другога — гэта рэальная магчымасць атрымаць грашовую падтрымку, якая сёлета як ніколі важная.

«Мы цэнім вытворцаў, якія імкнуцца прасоўваць перадавыя практыкі ў сваёй сферы: не толькі вырошчваюць прадукцыю, але і, рэальна ацэньваючы наступствы сваёй дзейнасці, імкнуцца зніжаць негатыўнае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе, — тлумачыць **спецыяліст па арганічнай сельскай гаспадарцы Цэнтра экалагічных рашэнняў Любамір КЛЕПАЧ.** — Разумеем, што гэты год выдаўся асабліва складаны. Асенне-зімовы перыяд быў рэкордна цёплы, амаль не было снегу, што можа знізіць ураджайнасць. Акрамя неспрыяльных прыродна-кліматычных умоў свой унёсак у фінансавую ўстойлівасць сельгаспрадпрыемстваў робіць і пандэмія каранавіруса, асабліва ўразлівыя тут сярэднія і дробныя вытворцы. Нам вельмі хацелася б іх падтрымаць».

У конкурсе могуць удзельнічаць прадстаўнікі фермерскіх і іншых невялікіх сельскагаспадарчых вытворчасцяў, якія знаходзяцца ў зоне вадазбору Балтыйскага мора ў Беларусі (Гродзенская, Віцебская і частка Мінскай і Брэсцкай абласцей). Больш падрабязныя ўмовы ўдзелу, а таксама заяўку можна знайсці на сайце арганізатараў https://www.ecoidea.by

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

На слыху

## Эпідэміёлаг:

# «Праз месяц мы выйдзем на ўстойлівае зніжэнне захваральнасці»

**У Беларусі зарэгістравана 19 255 чалавек са станоўчым тэстам на COVID-19. З іх папраўліся і выпісаны 4388 пацыентаў. За ўвесь час распаўсюджвання інфекцыі ў Беларусі ад яе памерлі 112 чалавек. Прырост за апошнія суткі склаў 905 інфіцыраваных. Выканана 220 045 тэстаў, колькасць захварэлых складае 8,7 працэнта ад гэтай лічбы.**

Дарэчы, па колькасці праведзеных тэстаў на адзін мільён насельніцтва Беларусь займае 2-е месца сярод краін СНД (пасля Расіі) і 37-е месца ў свеце. Пра гэта ў эфіры тэлеканала «Беларусь1» паведаміла **намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ГЛІНСКАЯ.**

— Але лічба праведзеных тэстаў без яе аналізу мала пра што сведчыць. У нас усё ж размова ідзе пра мэтанакіраванае абследаванне тых кантынгентаў, у якіх рызыка ўзнікнення захворвання большая. Гэта кантакты першага ўзроўню, людзі з пнеўманіяй. У нас паслядоўная тактыка лабараторнай дыягностыкі, і гэта дазваляе пры мінімальнай колькасці праведзеных тэстаў выяўляць максімальную колькасць выпадкаў, а самае галоўнае — правесці мерапрыемствы, якія не дазваляюць захворванню распаўсюджвацца далей, — падкрэсліла спецыяліст.

Ірына Глінская канстатавала, што цяпер назіраецца зніжэнне захваральнасці па Віцебскай вобласці.

— Мяркуем, што праз месяц, магчыма, нават да канца гэтага месяца мы выйдзем на ўстойлівае зніжэнне захваральнасці (ва ўсёй краіне. — **«Зв.»**), тады можна будзе казаць пра далейшыя прагнозы.

Што датычыцца прагнозаў, то той, што быў распрацаваны беларускімі эпідэміёлагамі, вірусолагамі і інфекцыяністамі ў пачатку ўспышкі ў нашай краіне, пакуль апраўдваецца цалкам. Пры яго складанні ўлічваліся розныя параметры — ад інкубацыйнага перыяду віруса да сацыяльных аспектаў (у прыватнасці, той факт, што ў выхадныя меры сацыяльнага дыстанцыравання выконваюцца не так дакладна, як у будні дні).

— Прагноз цалкам спраўджваецца, хіба што ў апошнія паўтара тыдня з'явіўся зрух на адзін дзень. Тыя меры, што мы прымаем, эфектыўныя, працуюць і дазваляюць нам прадухіляць дастаткова вялікую колькасць захворванняў, не дапусціць лавінападобнага росту, — запэўніла Ірына Глінская.

**Алена КРАВЕЦ.**

Ведай нашых!

# Рыцар добрага сэрца



**Вядомы беларускі пісьменнік, рэдактар, грамадскі дзеяч Уладзімір Ліпскі ўганараваны тытулам «Рыцар дзяцінства». Такое рашэнне напярэдадні юбілею пісьменніка прыняла Міжнародная асацыяцыя дзіцячых фондаў.**

Гэтае грамадскае званне, як зазначыў старшыня агульнарасійскай грамадскай дабрачыннай арганізацыі «Расійскі дзіцячы фонд» Альберт Ліханаў, было прысуджана ўдзельнікамі асацыяцыі аднагалосна — за вялікі ўнёсак у абарону дзяцінства і за шматгадовую плённую дзейнасць, скіраваную на патрыятычнае, маральнае выхаванне падрастаючага пакалення, умацаванне сяброўства паміж народамі Саюзнай дзяржавы. Акрамя пачэснага тытула, Уладзімір Ліпскі атрымаў адмысловыя сімвалы — Дыплом гонару, рыцарскую мантыю і шпагу.

Нагадаем, Уладзімір Ліпскі — аўтар звыш 70 кніг апавесцяў, казак, нарысаў, публіцыстычні агульным тыражом каля 1,5 мільёна паасобнікаў, галоўны рэдактар дзіцячага часопіса «Вясёлка», заснавальнік Усебеларускага фестывалю народнага гумару ў Аўцюках, лаўрэат літаратурных прэмій імя Янкі Маўра, Васіля Віткі, Аляксандра Грына, Дзяржаўнай прэміі Беларусі і іншых, кавалер ордэна Францыска Скарыны. Больш за трыццаць гадоў ён узначальвае Беларускі дзіцячы фонд, дзейнасць якога ў 2013 годзе была адзначаная высокай узнагародай — прэміяй Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне». Акрамя таго, Уладзімір Сцяпанавіч уваходзіць у нацыянальную камісію па справах дзяцей, па яго ініцыятыве здзейснены шэраг дабрачынных праектаў рэспубліканскага і міжнароднага значэння.

Шчыра віншуем Уладзіміра Сцяпанавіча з высокім тытулам, а таксама з 80-годдзем, якое наш калега адзначыў 6 мая. Жадаем моцнага здароўя, творчага плёну і ўдзячных чытачоў!

# Па кім звоняць званы Хатыні?

## ЗАЗІРНІЦЕ Ў ДЗІЦЯЧЫЯ ВОЧЫ

Артур Гарыевіч упэўнены, што Хатынь — тое месца, якое патрабуе неаднаразовага наведвання. Нават узрост наведвальнікаў можа ўплываць на тое, якія думкі, адкрыцці будуць нараджацца падчас знаёмства з мемарыялам. Часта сюды прыязджаюць сем'ямі, і трэба бачыць рэакцыю маладых матуль, калі на стэле яны чытаюць узрост юных ахвяр: паўтара годзіка, тры, сем тыдняў... Яны інстынктыўна прыціскаюць бліжэй да сябе сваіх дзяцей. Гэтая інфармацыя нараджае страх і адчуванне, што такое ніколі не павінна паўтарыцца.

Зусім рознае ўспрыняцце гісторыі можа быць у школьнікаў і студэнтаў. Але для таго, каб яны не выйшлі адсюль з адчуваннем, што проста паглядзелі на чарговы помнік, з імі трэба працаваць, загадзя рыхтаваць да экскурсіі. Пра Хатынь напісаны кнігі, створаны фільмы, але ці выкарыстоўваецца гэта ў сістэме адукацыі?

— Падыходы павінны мяняцца. Калі мы гаворым пра падрастаючае пакаленне, тут не абысціся без сродкаў візуальнай інфармацыі. У першую чаргу яе трэба данесці да падлеткаў праз музеефікацыю прасторы. Я не маю на ўвазе мемарыяльны комплекс «Хатынь» — ён павінен захавацца ў першапачатковым выглядзе, і гэта не абмяркоўваецца. Я кажу пра стварэнне музея трагедыі беларускага народа. Мы часта сутыкаемся з тым, што наведвальнік Хатыні не разумее, куды ён прыехаў. Асабліва гэта датычыцца школьнікаў. Іх трэба паглыбіць у тыя падзеі, у гісторыю. Перш чым ісці да мемарыяла, яны павінны прайсці па пэўных залах. У нас ёсць фотадакументальная экспазіцыя, і яна, я б сказаў, жорсткая па сваім напаўненні. Але сёння гэтага мала, і цяпер вядзецца работа над стварэннем новай канцэпцыі музея, дзе будзе расказана пра ўсе пакуты нашай зямлі і пра тое, як ствараліся Хатынь, — дзеліцца дырэктар мемарыяла.

Звычайна музей — гэта сапраўдныя рэчы пэўнай эпохі. Але як расказаць, што адбывалася ў гады вайны, калі ўсё згарэла дашчэнту, а тое нямногае, што дасталі з зямлі, па сутнасці проста заржавелыя жалязякі? «Гэта для мяне ржавыя паўабгарэлыя вілкі дарагія. Я ўяўляю, як гаспадыня даставала імі гаршкі з печы. Маладым наведвальнікам яны ні пра што не скажуць. Але на сёння ёсць такія магчымасці, візуальныя сродкі, якія дапамагаюць убачыць і адчуць трагедыю спаленай вёскі ці бежанцаў — гэтая тэма ў нас зусім забытая. На перыферыі засталася і трагедыя маленькіх дзяцей. Сёння пра гэта гавораць і пішуць у вузкім коле спецыялістаў. Але гэта менавіта тая тэма, якую трэба ўзнімаць глабальна», — упэўнены Артур Гарыевіч.

І зноў жа, Хатынскі мемарыял — ці не самае красамоўнае месца для аповеду пра дзіцячыя пакуты: са 149 жыхароў Хатыні, што былі забітыя ці жывымі згарэлі ў агні 22 сакавіка 1943 года, — 75 дзяцей! Тым больш што помнікаў, прысвечаных дзіцячым трагедыям, у Беларусі якраз не хапае. Мы нават прыблізна не ведаем лічбу, колькі хлопчыкаў і дзяўчынак загінулі падчас вайны. А колькі сталі інвалідамі, сіротамі? А праз што прайшлі тыя, хто выжыў! «Без слёз, без уздрыгу я не магу чытаць успаміны чалавека, які, ужо дарослы, сівы, расказвае, як дзіцем бачыў абгарэлае цела маці, а на ім ляжаў яго маленькі брацік. Ён дакрануўся — і ад брацікa застаўся толькі попел», — дзеліцца дырэктар Хатынскага мемарыяла і прапануе ўявіць хлопчыка ці дзяўчынку, у якіх учора яшчэ былі сям'я, цёплы дом, людзі, якія любяць, але гэтага імгненна не стала, малы стаіць адзінокі і не разумее, што адбываецца. Такія моманты захаваліся на некаторых фатаграфіях, кадрах кінахронікі. Мы можам зазірнуць у здзіўленыя, спужаныя дзіцячыя вочы. Дзіцячы боль нікога не пакіне абыякавым. Таксама ў музеі захавалася цяжкая, складаная фатаграфія-сведчанне з архіваў фашысцкай фотахронікі. На ёй забіваюць сям'ю. Людзі стаяць на каленях. Нехта плача. Нехта хрысціцца. А на руках у маці зусім маленькае дзіця, яно глядзіць на вар'ята, што чыніць гэтае злачынства, і не разумее, чаму плача маці і што праз хвіліну для яго ўсё скончыцца.

Яшчэ жывое пакаленне дзяцей вайны, важна паспець сабраць іх успаміны. Сучасныя тэхнічныя сродкі дазваляюць нават запісаць відэаапавед і пакінуць нашчадкам, каб яны пасля маглі паглядзець. Важна, каб сучасныя дзеці ведалі не толькі імёны і прозвішчы дзяўчат, але і тое, што адбывалася, пра што думалі іх продкі. Памяць будзе жыць толькі тады, калі яна напоўнена зместам.

Гістарычныя пошукі не спыняюцца. Адкрываюцца новыя дэталі, якія датычацца як Хатыні, так і іншых вёсак ды населеных пунктаў. І неабавязкова шукаць смажаныя факты. Часам усплываюць дэталі, якія дапамагаюць больш паглыбіцца ў мінулае, адчуць эмоцыі. Апошні жывы сведка трагедыі Хатыні Віктар Андрэевіч Жалабковіч згадаў пра той жахлівы дзень, і нязначныя, звычайныя, здавалася б, дэталі ўражваюць як нішто іншае: «Свяціла сонца. Яшчэ гурбамі ляжаў снег. Беглі ручаі. Людзей выганялі з дамоў, у чым тыя былі, а дзеці ў асноўным басанож. Малыя скакалі цераз сакавіцкія лужыны, і пырскі ляцелі ў розныя бакі...»

Дырэктар мемарыяла ў Хатыні ўпэўнены, што абавязкова трэба працаваць над захаваннем памяці праз сем'і. Гэты працэс можна падштурхнуць. Неяк яму патрапілася інфармацыя пра конкурс, дзе праз сямейную фатаграфію школьнікам прапанавалі расказаць пра родных падчас вайны. Але ці толькі для дзяцей павінны праводзіцца такія конкурсы? Важна, каб далучаліся і дарослыя, сталыя людзі.

## ЦАГЛІНКА Ў ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ?

Некалькі гадоў таму супрацоўнікі мемарыяльнага комплексу атрымалі ліст з Ізраіля з просьбай падзяліцца інфармацыяй пра Хатынь. Музейныя работнікі падрыхтавалі пашыраную даведку, а пасля з Ізраіля ім даслалі пасылкай свежанькі падручнік — у ім цэлая старонка была прысвечана Хатыні. Аўтары навучальнага дапаможніка не маглі абмінуць увагай Хатынь — месца, дзе сканцэнтравана памяць пра жахлівую трагедыю цэлай краіны, напамін чалавецтву пра ўвесь той боль, які прынесла вайна. Але ці стала Хатынь цаглінкай у еўрапейскай гістарычнай памяці? Артур Зельскі (а ён працуе дырэктарам мемарыяльнага комплексу амаль дзесяць гадоў) заўважыў, што заходняе палітычнае кіраўніцтва не цешыць увагай мемарыял — ні адзін палітычны кіраўнік заходняй дзяржавы ніколі не быў у Хатыні. Можа, нам проста трэба знайсці іншы падыход да таго, каб паказаць значнасць і спецыфіку Хатыні ў сусветнай культуры памяці пра Другую сусветную вайну? Усё ж дзіўна, што адна-му з жахлівых складнікаў той вайны — трагедыі спаленых вёсак — у свеце не ўдзяляецца належнай увагі. За гады вайны ў Беларусі прайшло 140 буйных карных аперацый, у выніку якіх было спалена больш за пяць тысяч населеных пунктаў, у тым ліку 630 разам з усімі жыхарамі, а 4824 — з часткай насельніцтва.

Наогул падчас акупацыі ў полымі пажараў і разбурэнняў было знішчана 209 беларускіх гарадоў і раённых цэнтраў, больш за 9200 вёсак. Як можна «не заўважаць» гэтыя лічбы? Адна з частак мемарыяла, дзе захаваны жалобныя урны з зямлёй са 185 спаленых вёсак — гэта адзіны ў свеце «могільнік вёсак», якія не адрадзіліся пасля вайны! Ці трэба ахвяр дзяліць па нацыянальнасці? «У нас часам пытаюцца, чаму не вылучаны тыя ці іншыя групы. Але калі я гляджу кадры кінахронікі, якія здымала Надзвычайная камісія, бачу, як з зямлі дастаюць цельца дзіцяці, і ў яго соска. Я не ведаю нацыянальнасці гэтага дзіцяці, і ці так гэта важна? Вайна — у першую чаргу трагедыя гэтага немаўляці, сям'і, тых асоб, хто лёг у тую страшную магілу, — заўважае Артур Зельскі. — Усё тое страшнае, што нацызм планаваў здзейсніць у сусветным маштабе, апрабіравалася ў Беларусі. Гэта не мае словы, а Янкі Брыля, Алеся Адамовіча і Уладзіміра Калесніка, калі яны пісалі кнігу «Я з вогненнай вёскі», якая магла стаць у той час у Савецкім Саюзе інфармацыйнай бомбай. Але гэтага не адбылося».

Даносіць галасы людзей, якія перажылі кашмарныя трагедыі, трэба і цяпер. І сёння Хатынь запатрабавана — за мінулы год яе наведалі 250 тысяч чалавек. Каля 70 працэнтаў гасцей прыехалі з Расіі. У параўнанні з савецкім перыядам, напэўна, гэта невялікая лічба. Але не трэба забывацца, што раней прастора агульнай памяці была шырэйшая за адміністрацыйныя межы СССР, у краінах сацыялістычнага лагера не сумняваліся, хто здзяйсняў агрэсію і якой цаной давалася Перамога. Сёння ж нават у былых савецкіх рэспубліках гісторыя падпадае пад перагляд, назіраецца падмена сэнсаў.

«Нашы дзяды перамаглі самую страшную машыну знішчэння ў гісторыі чалавецтва. Калі б аўтарам тэорыі падзелу людзей на чыстых і нячыстых удалося рэалізаваць свае планы, нас бы сёння не было. Адсюль для мяне разуменне той значнасці, якую нясе ў сабе Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне, — заўважае **саветнік-пасланнік пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Пётр ФРАЛОЎ.** — Чым далей гэта дата ад нас, тым больш намаганняў трэба прыкладаць, каб памяць пра яе перадавалася з пакалення ў пакаленне».

Гісторыя — гэта частка ідэнтычнасці народа, і калі дзесьці прапануюць забыць пра тое, як паліліся вёскі, забіваліся мірныя жыхары, і пачынаюць пісаць гісторыю «з чыстага аркуша», ёсць вялікая небяспека, што знойдуцца і тыя, хто захоча напісаць на гэтым аркушы мацерныя словы.

Таму так важна не спыняць работу. Як паведаміў **вучоны сакратар Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Валерый НАДТАЧАЕЎ,** у Рэспубліцы Беларусь створана каля дзевяці тысяч мемарыялаў, і гэтая работа працягваецца. Але ці навучыліся мы чытаць гісторыю па помніках? Музей Вялікай Айчыннай вайны мог бы дапамагчы ў гэтым — усе асноўныя падзеі, якім прысвечаны тыя ці іншыя мемарыялы, адлюстраваны ў яго экспазіцыі. У залах размешчаны інфатэрміналы, якія дазваляюць аператыўна выкарыстоўваць архіўную і музейную інфармацыю.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота БелТА.



Фота БелТА.

**Трэба бываць у такіх месцах памяці, як дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь», каб зверыць сваё жыццё і ўчынкі з тым, дзеля чаго аддалі свае жыцці вызваліцелі беларускай зямлі, дзеля чаго пакутавалі нявінныя людзі, забітыя і закатаваныя фашыстамі. Такое меркаванне выказаў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар Петрышэнка на ўрачыстым мерапрыемстве «Дзень памяці» ў мемарыяльным комплексе «Хатынь», якое прайшло ў аўторак. Удзельнікі мерапрыемства ўсклалі кветкі да Вечнага агню і ўшанавалі памяць загінулых хвілінай маўчання.**

# «БЕЛАРУСЬ ПАМЯТАЕ. САЛДАТЫ ПЕРАМОГІ»

**Старт рэспубліканскаму праекту пад такой назвай, скіраванаму на ўшанаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і прысвечанаму 75-годдзю Перамогі, дае БРСМ.**

Актыў маладзёжнай арганізацыі з 7 да 9 мая падчас праекта «Беларусь памятае. Салдаты Перамогі» павіншуе ветэранаў, вязняў канцлагераў, працаўнікоў тылу з Днём Вялікай Перамогі. З улікам няпростай эпідэміялагічнай абстаноўкі ўшанаванні будуць дамашнія. Праводзіцца яны сумесна з аддзеламі культуры і ваеннымі камісарыятамі па ўсёй краіне. У праекце возьмуць удзел і прадстаўнікі Беларускай піянерскай арганізацыі. Форма такіх ушанаванняў будзе самая розная — ад святочных паштовак з цёплымі словамі падзякі за мірнае неба і пажаданнямі моцнага здароўя да перадачы памятных медалёў, творчых нумароў, выступленняў у дварах пад вокнамі гэтых заслужаных людзей.

Напрыклад, 8 мая сталічныя актывісты прыйдуць у госці да Героя Савецкага Саюза Івана Ільіча Кустава з аркестрам, расцяжкай «Дзякуй за Перамогу», кветкамі і памятнымі падарункамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
7 МАЯ 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 8 (15885)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года



Імёны

Аляксей ГРОС:

# «Мне важна, каб былі муза і стымул»

**Гэты таленавіты хлопец з Салігорска быў уладальнікам Гран-пры «Славянскага базару — 2016», удзельнікам адборачных тураў на «Еўрабачанні». Тым часам у біяграфіі артыста пішуцца новыя старонкі. Аляксей працягвае выпускаць песні, рыхтуецца да адкрыцця музычнай школы для дзяцей, асвойваецца ў акцёрскім асяродку Тэатра эстрады. Пра тое, што яго матывуе, дзе пачынаецца новы перыяд у яго творчасці і як быць самім сабой незалежна ад абставін, мы распыталі суразмоўніка пры сустрэчы.**

***— Нядаўна ў Тэатры эстрады адбылася прэм'ера беларускамоўнага мюзікла-прытчы «Ты і я», дзе вы з'явіліся ў галоўнай ролі... Ці лёгка асвоіліся ў новым амплуа?***

— Туды я трапіў пасля кастынгу, і тут пачаліся эксперыменты, якія мне як артысту вельмі цікавыя. Бо я заўсёды за магчымасць развівацца, а рэжысёр Уладзіслава Арцюкоўская бачыць, дзе я магу праявіць сябе, і ставіць мяне ў свайго кшталту экстрэмальныя ўмовы. Для творчага чалавека вельмі карысны стан выхаду з зоны камфорту. Пачалося ўсё, калі я вёў навагодні канцэрт у Палацы рэспублікі. Вядучы, які спявае, — гісторыя, да якой я ставіўся заўсёды негатыўна, бо лічыў, што трэба займацца нечым адным. А тут выпала магчымасць раскрыць свой патэнцыял у новым кірунку. Такія этапы патрэбныя. Але калі прапанавалі галоўную ролю ў мюзікле, то я спужаўся. Па-першае, гэта мюзікл-прытча, а я ж зусім не прыклад для пераймання, не паводжу сябе так, каб трансліраваць гэта людзям. А заяўлены жанр у маім уяўленні — якраз вельмі правільная гісторыя. Па-другое, беларуская мова пастаноўкі таксама мяне бянтэжыла. Я люблю яе, выконваю песні на ёй, але пастаянна не размаўляю. Таму ўзяў час на роздум. І праз некалькі дзён зразумеў: хачу быць часткай гэтай падзеі.

Насамрэч, я камандны гулец, і вельмі ясна гэта ўсвядоміў пасля сыходу з прадзюсарскага цэнтра «СПАМАШ». Саліст не можа быць універсальным байцом, калі хоча паказваць узровень. Тут жа я бачыў, што ёсць каманда і будзе магчымасць паглыбіцца ў творчы працэс, адасобіўшыся ад мітусні паўсядзённага жыцця. А паколькі на цябе спадзяюцца, то ты даб'ешся выніку. Былі рэпетыцыі кожны дзень, і работа ў камандзе аднадумцаў вельмі захапіла. Успамінаў час падрыхтоўкі да «Славянскага базару», калі таксама ўдалося тварыць з камандай мары. Я мог спаць па некалькі гадзін, а потым зноў бегчы працаваць.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Карысны досвед

# СЭРВІС АД СТУДЭНТАЎ — НА ЎЗРОЎНІ!

**Як гэта — быць часткай аднаго з найлепшых студатрадаў краіны? Дваццацігадовая Дар'я КІРЫЛАВА, студэнтка-трэцякурсніца спецыяльнасці «Аўтаматызацыя харчовых працэсаў і вытворчасцяў» Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання, на гэтае пытанне можа адказаць дакладна. На працягу двух гадоў яна была камандзірам сэрвіснага атрада імя двойчы Героя Савецкага Саюза І. І. Якубоўскага, а таксама штаба працоўных спраў БРСМ свайго ўніверсітэта. І столькі ж гэты атрад вызначаўся як найлепшы ў краіне ў сваёй намінацыі падчас традыцыйнага Усебеларускага з'езда студэнцкіх атрадаў «Маладосць. Праца. Рамантыка». Мы пагутарылі з Дар'яй і дазналіся пра атрыманы ёю вопыт.**



Каманда сэрвіснага атрада.

— Я даведалася пра магчымасць такой падпрацоўкі на першым курсе. Тады студэнтам прапанавалі паехаць у санаторый «Нарач» Мядзельскага раёна. Безумоўна, захацелася. Тым больш я вельмі люблю гатаваць, гэта для мяне — заспакаенне і асаблівы від медытацыі. Дзякуючы таму што я актыўна брала ўдзел у грамадскай дзейнасці ўніверсітэта, у якасці камандзіра абралі мяне.

Перад тым як прыступіць да працы, студэнты прайшлі пэўныя іспыты...

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

Незвычайнае хобі

# ЗАХОПЛЕНЫ... ДЫНАЗАЎРАМІ

## СЛЕД АЛОЎКА АД МЕЗАЗОЮ ДА НАШЫХ ДЗЁН

**Дзмітрый ТАКАЛЬЧЫК — навуковы супрацоўнік лабараторыі нейрафізіялогіі Інстытута фізіялогіі НАН Беларусі, займаецца вывучэннем работы мозга. А яшчэ ў маладога навукоўца ёсць цікавае хобі: дваццацівасьмігадовы хлопец малюе... дыназаўраў, арыентуючыся на сучасныя навуковыя даныя. І робіць гэта вельмі ўдала, адно з пацвярджэнняў таму — публікацыя яго работы «38 адкрытых у 2018 годзе відаў дыназаўраў» у National Geographic (Расія).**



Палеанталогіяй Дзмітрый захапіўся ў дзяцінстве. У тыя часы выходзілі такія папулярныя фільмы і серыялы, як «Прагулкі з дыназаўрамі», «Парк юрскага перыяду», «Зямля да пачатку часоў», што сталі штуршком для развіцця яго творчасці.

— Здольнасці да малявання дасталіся мне ад бацькі. Як вывучаў патрэбную інфармацыю аб дыназаўрах? Часта хадзіў па кніжных крамах роднага Наваполацка, доўга разглядваў прыгожыя малюнкі ў розных выданнях і чытаў цікавыя артыкулы, — прыгадвае суразмоўнік.

Любоў да прыроды і ўсяго жывога вызначыла яго выбар хіміка-біялагічнага профілю, калі Дзмітрый вучыўся ў старшых класах. Ездзіў на розныя алімпіяды, на адной з іх — на рэспубліканскім узроўні па біялогіі — атрымаў дыплом трэцяй ступені, што дало магчымасць паступіць на біялагічны факультэт БДУ без экзаменаў.

Навыкі малявання спатрэбіліся і падчас навучання ва ўніверсітэце. Так, на першых курсах па некаторых дысцыплінах студэнтам трэба было весці альбомы: замалёўваць усё, што яны бачылі, — ад раслінных клетак да канечнасцяў насякомых.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
07 05 2020 г.

Старт кар'еры

# СВОЙ БІЗНЕС ДА... 18,

## або ЦІ ВОЗЬМЕЦЕСЯ ВЫ ВЫПЯКАЦЬ БУЛАЧКІ З СЫРАМ?

**Канферэнцыя «Guru Будучыні», якая ўжо становіцца традыцыйнай, чарговы раз аб'яднала крэатыўных юнакоў і дзяўчат, а таксама маладых спікераў-наватараў, заснавальнікаў уласных бізнесаў. Дзякуючы ёй захапіліся вопытам і заматывавалі сябе на стварэнне цікавых праектаў многія падлеткі і студэнты.**

Ці чулі вы пра такеноміку ці смарт-кантракт? Для пятнаццацігадовага **блокчэйн- і вэб-распрацоўшчыка, заснавальніка праектаў Beat-Buy і FutureDay, выпускніка TeenGuru Business Academy і Imaguru Blockchain School Мікалая КАРНІЛАВА** гэтыя паняцці гучаць цалкам звыкла.



**Мікалай Карнілаў.**

— У аснове тэхналогіі блокчэйну — размеркаванне інфармацыі, якая захоўваецца на камп'ютарах усіх карыстальнікаў сеткі, — уводзіць у курс справы Мікалай. — Яе кадзіруюць асаблівым чынам — адмысловым шыфрам. Кожны наступны запіс аб'ядноўваецца з папярэднім, атрымліваецца паслядоўнасць блокаў, звязаных віртуальным «ланцугом». Такім чынам, каб знайсці нешта, тым жа «хакерам» трэба разблытаць усю паслядоўнасць. Даволі цяжка для іх і надзейна для сістэмы. Смарт-кантракт — камп'ютарны алгарытм, прызначаны для кантролю і выдачы пэўных звестак. Усе ахвотныя могуць перадаваць паміж сабой віртуальныя аналагі грошай. Як прыклад — жэтон у метро. З яго дапамогай мы можам трапіць у поезд, але ж гэта не манета ў звычайным разуменні. А крыптавалюты — толькі адзін са спосабаў выкарыстання блокчэйна.

**«Ніхто з патэнцыйных партнёраў не спытаў пра ўзрост, бо яны бачылі, што мы ставімся да сваёй работы вельмі адказна».**

Некалькі гадоў таму Мікалай наведваў хакатоны ў ПВТ. Спадабацца «айцішны» дух, захацелася паўдзельнічаць у іншых конкурсах, паспрабаваць свае сілы на стартап-пляцоўках. Прайшоў курс у TeenGuru, падчас заняткаў у хлопца сталі з'яўляцца ідэі праектаў. Так нарадзіўся першы — Beat-Buy: сайт і мабільная праграма для продажу і куплі за ўнутраную крыптавалюту музычных бітаў... Сваім аднагодкам малады суразмоўнік заўсёды дае параду: трэба многа і ўпарта займацца самаадукацыяй. «Замест камп'ютарных гульняў паспрабуйце асвоіць якую-небудзь мову праграмавання або прыдумайце нейкую гульню самастойна».

— Праз 10–15 гадоў такеноміка стане асновай эканомікі розных краін, — лічыць юнак. — Яна ўжо выкарыстоўваецца ў шматлікіх галінах, напрыклад, у сферы кіравання персаналам або там, дзе патрабуецца надзейна захаваць шмат інфармацыі. Просты прыклад са школьнага жыцця — электронны дзённік. Былі выпадкі, калі падлеткі іх узломвалі. Але калі б такая рэч функцыянавала з выкарыстаннем блокчэйну, зрабіць гэта было б немагчыма. Дарэчы, такеноміка — гэта яшчэ і аўтаматызацыя працы: саму складаную за нас ужо выконваюць робаты.

Упартасць заўсёды дапамагае тым, хто хоча зарабіць добрыя грошы. Так лічыць, абапіраючыся на ўласны досвед, **стваральніца агенцтва Popcorn Media, практыкуючы SMM-спецыяліст і капірайтар Каміла ЖЫБУЛЯ.** Гэтая дзяўчына прайшла праз дзясяткі кампаній, каб атрымаць першую работу. Яна ўпэўнена, што для таго, каб набыць прафесійны вопыт, у падлеткаў павінна быць разуменне: трэба шукаць карысныя кантакты, знаёміцца з вялікай колькасцю людзей. А яшчэ хадзіць на разнастайныя бясплатныя канферэнцыі, семінары, майстар-класы, курсы, якія каштуюць мала або ўвогуле нічога не каштуюць. Бо яны даюць матывацыю на тое, каб у будучыні стварыць нешта сваё.



**Каміла Жыбуля.**

— У жыцці вельмі важна паставіць сабе мэту і прытрымлівацца яе, нягледзячы на перашкоды. Многія з нас часта сумняваюцца ў сабе, але разам з тым унутры павінна быць дакладнае перакананне, што вы зможаце ўсё. Напрыклад, любая бізнес-ідэя можа працаваць, нават калі яе пратэсціравалі на некалькіх людзях. Галоўнае — спрабаваць, — падзялілася Каміла.

**«У жыцці вельмі важна паставіць сабе мэту і прытрымлівацца яе, нягледзячы на перашкоды».**

Маладых удзельнікаў бізнес-сустрэчы спікер запэўніла: каб уладкавацца на вакансію адміністратара анлайн-школы, вэб-дызайнера, вэб-аналітыка, фатографа, менеджара блогера або сторыз-мейкера, профільная адукацыя не патрабуецца.

Як адкрыць бізнес без стартавага капіталу, а пасля вырасці ў міжнародны праект, які ахапіў 255 гарадоў? Адказ ведае **заснавальнік «Мазгабойні» Аляксандр ХАНІН.** Яго інтэлектуальная гульня ў першую чаргу забаўляльная, аднак ужо сем гадоў гэта таксама і буйны бізнес.



**Аляксандр Ханін.**

— Страхі бясследна марнуюць наш час, абмяжоўваючы развіццё. Самы галоўны з іх у людзей, якія не сутыкаліся з адкрыццём сваёй справы, — міф аб тым, што для яе рэалізацыі трэба шмат грошай і сувязяў. Аднак гэта не так. У 2013 годзе мы не мелі вялікага стартавага капіталу, нават не ведалі, што такое франшыза, а першымі кліентамі былі знаёмыя і сябры. Развіваліся праз «сарафаннае радыё». Цяпер у нашу паб-квіз віктарыну гуляюць амаль усе гарады краіны, а гадавы абарот кампаніі складае каля 100 мільёнаў рублёў. Не трэба баяцца дзяліцца сваёй ідэяй з тымі, хто вас акружае. Заўсёды знойдзецца нехта, хто вам дапаможа, адшукае патрэбныя кантакты або праспансіруе праект. Часцей за ўсё любая ідэя, якая прыйшла ў вашу галаву, ужо была кімсьці рэалізаваная. Але гэта не павінна спыняць. Не трэба баяцца канкурэнтаў, іх трэба любіць. Яны — ваш матыватар, — упэўнены Аляксандр Ханін.

Ідэя нічога не каштуе, калі яе не рэалізаваць. Так лічыць **удзельнік праграмы паскарэння ў Starta Accelerator і пераможца Startup Competition на Venture Day Minsk, стваральнік сэрвісу штучнага інтэлекту BotScape Павел ЛІТВІНКА.** Хлопец ведае, як школьнікам і студэнтам знаходзіць нішы для стартап-праектаў.



**Павел Літвінка.**

— Будзьце на хвалі актуальных падзей і плыняў, сачыце за буйнымі кампаніямі. Грошы прыносіць той прадукт, які ў пэўны момант вельмі запатрабаваны. Напрыклад, трэндавы від размалёвак — піксель-арт. Пачаткам масавай цікавасці да яго стаў выпуск мабільнай праграмы распрацоўшчыкамі з Пензы. Іх праект хутка стаў папулярны, і цяпер яны зарабляюць на сваёй распрацоўцы два мільёны долараў у месяц. Ёсць катэгорыя тавараў, якія заўсёды павінны існаваць. На іх таксама варта звярнуць увагу. Напрыклад, булачкі з сырам — іх продаж не спыніцца яшчэ шмат дзесяткаў гадоў, пытанне толькі ў тым, возьмецеся за іх вы або хтосьці іншы, — расказвае Павел Літвінка.

**«Замест камп'ютарных гульняў паспрабуйце асвоіць якую-небудзь мову праграмавання або прыдумайце нейкую гульню самастойна».**

Дарэчы, кампанія спікера ў свой час занялася распрацоўкай, здавалася б, чарговага анлайн-перакладчыка. Але цяпер яны маюць з яго 30 мільёнаў загрузак і зарабляюць мільён долараў. Як так атрымалася? Павел лічыць, што не трэба саромецца рэалізоўваць штосьці падобнае на прадукт, які ўжо існуе на рынку, аднак рабіць гэта трэба ў разы лепш, чым канкурэнты.

Як стварыць мерапрыемствы для падлеткаў, калі табе 16? **Іван УЛАСАЎ, член каманды TeenStart, якая арганізоўвае розныя івэнты для юнакоў і дзяўчат,** расказаў пра гэта на прыкладзе свайго вопыту.



**Іван Уласаў.**

— Актыўную дзейнасць у рэалізацыі праектаў я пачаў больш за год таму. Быў частым госцем на розных канферэнцыях для дарослых, і гэта матывавала зрабіць нешта падобнае для падлеткаў, каб яны развіваліся разам са мною. Знайшоў добрую каманду, але спачатку не пакідалі думкі, што нас не будуць успрымаць усур'ёз. Хваляваліся аб тым, як будзем пісаць дырэктарам, кіраўнікам кампаній. Але прыемна здзівіліся, калі ніхто з патэнцыйных партнёраў не спытаў пра ўзрост, бо яны бачылі, што мы ставімся да сваёй работы вельмі адказна. Памятаю, што за тыдзень да першага мерапрыемства ў нас было прададзена 60 білетаў пры заяўленых 150... Нельга было сказаць: гэта аказалася занадта цяжка, я, напэўна, спынюся. Зразумела, што некаму іншым часам прасцей купіць каву за чатыры рублі, чым укласці іх у самаразвіццё. Таму перад сустрэчай мы тэлефанавалі ўсім тым, хто падаваў заяўку на сайце, — быў важны кожны, хто прыйдзе да нас, — дзеліцца Іван.

Хлопец заклікае падлеткаў шукаць свае так званыя моцныя бакі.

— Калі я пачаў займацца праектамі, разумеў, што мне не хапае ведаў у сферы SMM, вэб-дызайне. Але любіў нэтворкінг, падабалася размаўляць з вялікай колькасцю людзей, вырашаць іх праблемы і адказваць на пытанні. Аднойчы для бізнес-сустрэчы знялі памяшканне не ў цэнтры горада. Зразумела, што многім было нязручна туды дабірацца, але мы зрабілі акцэнт на вядомых спецыялістах-спікерах — запрасілі самых лепшых, на наш погляд, і ўбачылі поўную залу наведвальнікаў.

**«Запомніце: ніхто нічога нікому не павінен. Любая тэхнічная праблема — ваша адказнасць, штосьці не выйшла — ваш правал».**

Але так бывае не заўсёды, кажа Ваня, таму трэба ўмець аналізаваць няўдачы:

— У нас былі мерапрыемствы, якія сабралі пяць чалавек, а былі і тыя, што 25. Спачатку не было зразумела, чаму так адбываецца: адны і тыя ж партнёры, адзін і той жа бюджэт на рэалізацыю праекта, але спікеры — розныя. Вынік: людзі ідуць за людзьмі. Калі правільна падабраць цікавых вашай аўдыторыі аўтарытэтных персон, з большай імавернасцю чакайце прыемных водгукаў. Але не варта забываць пра тэму выступлення — яна можа быць не блізкая для той узроставай катэгорыі, якую вы запрасілі. Калі спікеры не ўмеюць удала выказваць свае думкі, гэта можа стаць праблемай падчас мерапрыемства.

Суразмоўнік даў параду падлеткам: «Запомніце: ніхто нічога нікому не павінен. Любая тэхнічная праблема — ваша адказнасць, штосьці не выйшла — ваш правал. Але не варта яго палохацца. Дональд Трамп шэсць разоў станавіўся банкрутам. Калі ён можа дазволіць сабе няўдачы, дык чаму мы павінны іх абыходзіць? Яны — наш вопыт, асабліва на раннім этапе рэалізацыі сябе ў нейкай сферы. Бо іншым часам поспех дае «карону на галаве», якая ціснe на мозг і ён перастае па-сапраўднаму працаваць».

**«Не трэба баяцца канкурэнтаў, іх трэба любіць. Яны — ваш матыватар».**

Дарэчы, тым, у каго ёсць iPhone, Іван Уласаў раіць час ад часу глядзець на функцыю «экранны час». Тады будзе зразумела, на што вы губляеце свае хвіліны і гадзіны, седзячы ў тэлефоне.

— Прадпрымальніцтва робіць чалавека дарослым, — упэўнены малады спікер. — У ім ёсць адказнасць: не выканаў умоў, і з табой перастануць весці справы. Да таго ж тут разумееш, што для дасягнення поспеху вельмі важная каманда. Сёння не праблема знайсці захопленых пэўнай справай падлеткаў, іншая справа, што ў свае 15-16 гадоў яны могуць быць ужо кімсьці занятыя, і ваша задача — паспець іх перахапіць да таго моманту, пакуль яны не стануць часткай іншай кампаніі.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

*Акцыі*

## У падтрымку людзей у белых халатах

**Рэспубліканскі цэнтр біяэтыкі запрашае студэнтаў і старшакласнікаў далучыцца да творчага мерапрыемства. Яго мэта — падтрымаць медыцынскіх работнікаў, якія сёння на «передавой», каб аб прафесійным подзвігу гэтых людзей ведала ўся краіна.**




Умовы ўдзелу:

1. Самастойная падрыхтоўка творчай работы. Гэта можа быць артыкул-інтэрв'ю (дзе вы можаце расказаць пра знаёмых медработнікаў), эсэ на тэму этычных праблем медыцыны, малюнкі/плакаты/інсталяцыі, відэаролікі; музычныя фрагменты і г. д.

2. Работы трэба даслаць на пошту actionbioethics@gmail.com (у электронным выглядзе) або праз выкладчыкаў з абавязковым указаннем прозвішча, імя (поўнасцю), горада, ВНУ і курса, студэнтам якога з'яўляецца аўтар ці аўтары, навучальнай установы і класа.

Тэматыка шырокая, галоўныя тэмы: «Людзі ў белых халатах» (як змянілася стаўленне да медыцынскіх работнікаў у сітуацыі пандэміі); «Урач і пацыент: правы і абавязкі»; «Уразлівыя грамадзяне і дапамога ім у сітуацыі пандэміі»; «Вострыя біяэтычныя праблемы, якія «высвяцілі» COVID-19».

Супрацоўнікі Рэспубліканскага цэнтра біяэтыкі будуць адбіраць самыя цікавыя творчыя работы і размяшчаць іх на сайце ўстановы і ў сваёй групе на «Фэйсбуку».

*Рука дапамогі*

## «Будучыя педагогі — дзецям»

**Анлайн-праект БДПУ пад такой назвай уключаны ў спіс найлепшых па дыстанцыйным навучанні.**

У красавіку Міжнародны фонд Aflatoun International падрыхтаваў агляд розных падыходаў да арганізацыі навучання дзяцей ва ўмовах эпідэміялагічнай сітуацыі, звязанай з COVID-19. У ім таксама прадстаўлены найлепшыя інавацыйныя захады па дыстанцыйным навучанні школьнікаў. Сярод іх — валанцёрскі адукацыйны анлайн-праект БДПУ «Будучыя педагогі — дзецям».

Міжнародны фонд Aflatoun International займаецца пытаннямі сацыяльнай і фінансавай адукацыі дзяцей і моладзі ва ўзросце ад трох да дваццаці пяці гадоў. Ім распрацаваны адукацыйныя праграмы, якія рэалізуюцца больш чым у 100 краінах свету. Фонд супрацоўнічае з 300 партнёрскімі і ўрадавымі арганізацыямі.

Валанцёрскі адукацыйны анлайн-праект «Будучыя педагогі — дзецям» быў запушчаны ў БДПУ 13 красавіка. Яго сутнасць заключаецца ў тым, што студэнты старшых курсаў універсітэта, а таксама навучэнцы педагагічных класаў праводзяць анлайн-урокі па вучэбных прадметах для школьнікаў з 1 да 11 класа. Трансляцыя заняткі на афіцыйным YouTube-канале БДПУ. Там жа размяшчаюцца іх запісы.

*Не выходзячы з дому*

## БДУ запусціў віртуальны 3D-тур



**Стаць госцем анлайн-экскурсіі можа любы ахвотны. На цяперашнім этапе віртуальны 3D-тур уключае 100 панарамных здымкаў 11 факультэтаў і чатырох устаноў адукацыі, якія ўваходзяць у структуру ўніверсітэта, а таксама Ліцэя БДУ. Гэты спіс у найбліжэйшы час будзе дапоўнены.**

Пачаць анлайн-падарожжа па ўніверсітэце можна з галоўнага корпуса, наведаўшы аўдыторыі, Фундаментальную бібліятэку, сталоўку, лабараторыі і іншыя памяшканні ВНУ. На біялагічным факультэце можна зазірнуць у заалагічны музей, а на юрыдычным — у музей правазнаўства і лабараторыю крыміналістыкі. Гістарычны факультэт пакажа сваю славутасць — музей нумізматыкі, а факультэт журналістыкі запросіць у тэлепавільён і студыю гуказапісу.

Дэталёва вывучыць архітэктуру і дызайн універсітэта дапамагаюць спецыяльныя опцыі на віртуальнай панэлі. Панарамная выява транслюецца на 360°, таксама можна павялічваць і памяншаць маштаб карцінкі.

Віртуальны 3D-тур падрыхтаваў Цэнтр карпаратыўных камунікацый БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Даніна пашаны*

## ПРЫГАДАЦЬ ПОДЗВІГІ ПРОДКАЎ

**Тэматычную рубрыку да 75-годдзя Перамогі запусціў на сваім сайце Універсітэт МНС. У ёй выкладчыкі, слухачы і курсанты ўспамінаюць і расказваюць пра сваіх дзядоў і прадзедаў, якія ваявалі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

У матэрыялах выкарыстаны ўнікальныя фатаграфіі франтавікоў з сямейных архіваў прадстаўнікоў універсітэта МНС. Большасць здымкаў ветэранаў апублікавана ўпершыню. Акрамя таго, фармат тэматычнай рубрыкі прадугледжвае ўдзел у ёй усіх ратавальнікаў краіны.

Падобнае мерапрыемства праводзіць і БРСМ, даўшы старт інтэрнэт-чэленджу фатаграфій «#Беларусьпомнит». Каб далучыцца да яго, неабходна размясціць у сацыяльных сетках Instagram, «УКантакце», «Аднакласнікі», Facebook фатаграфію члена сям'і — удзельніка Вялікай Айчыннай вайны і дапоўніць публікацыю інфармацыяй пра тое, хто адлюстраваны на здымку (прадзед, дзед, бацька і г. д.), у якой часці служыў падчас Вялікай Айчыннай вайны, якія вайсковыя ўзнагароды мае. Пад фота неабходна паставіць хэштэгі #Беларусьпомнит, #ЦветыВеликойПобеды і перадаць эстафету памяці сваім сябрам.

Чэлендж будзе праходзіць да 9 мая ўключна. Арганізатары ўпэўнены, што, як і летась, у яго актыўна ўключацца і моладзь, і людзі старэйшага пакалення.

Інтэрнэт-чэлендж «#Беларусьпомнит» — частка рэспубліканскага патрыятычнага праекта «Кветкі Вялікай Перамогі». Падчас яго актывісты БРСМ па ўсёй краіне пад дэвізам «Беларусь памятае. Ніхто не забыты. Нішто не забыта» займаліся добраўпарадкаваннем помнікаў і абеліскаў. Акрамя таго, Саюзам моладзі былі рэалізаваны праект «Беларусь памятае. Памятаем кожнага», On Air марафон «Беларусь памятае. Кветкі Вялікай Перамогі» ды іншыя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# СЭРВІС АД СТУДЭНТАЎ — НА ЎЗРОЎНІ!

— Усіх нас чакала навучанне, якое доўжылася некалькі месяцаў. У каманду трапілі не ўсе — толькі самыя працавітыя і адказныя. Ужо пазней, як камандзір, я самастойна арганізоўвала сустрэчы, каб настроіць калектыў на прадукцыйны працоўны семестр, які распачаўся ў ліпені. На аб'екце мы выконвалі абавязкі афіцыянтаў і памочнікаў кухараў з дзесяці да пяці гадзін вечара на працягу месяца, — кажа Даша.

На другім курсе суразмоўніца таксама «загарэлася» летняй працай у студатрадзе. Здаўшы датэрмінова залікі і экзамены, яна апынулася ў складзе сэрвіснага атрада на II Еўрапейскіх гульнях.



**Камандзір Дар'я Кірылава *(справа)* і камісар Таццяна Дзянісенка.**

**«Многія са студэнтаў ідуць у атрад, каб падзарабіць. Але пасля таго, як яны праходзяць хоць праз адзін працоўны семестр, пачынаюць разумець, што атрымліваюць нашмат больш. Гэта і новыя знаёмствы, і развіццё сваіх здольнасцяў...»**

— Наша каманда з дваццаці чатырох чалавек абслугоўвала спартсменаў, мы гатавалі і падавалі ім стравы. Рабілі гэта на розных аб'ектах. Хтосьці адказваў за выдачу гарачага, нехта наліваў супы, накладваў салаты. Або працаваў непасрэдна на кухні, напрыклад, гатаваў пасту або соусы. Я дапамагала су-шэфу на станцыі халодных страў і закусак. Рытм быў шалёны. Чарга спартсменаў выстройвалася на кіламетр усяго за некалькі хвілін, таму гатаваць і падаваць усё трэба было максімальна хутка. Нядзіўна, што часам сіл на забавы, кшталту паходаў у кіно, проста не хапала. Прыходзіш пасля змены ў інтэрнат — адразу ў душ і спаць. Але гэта выхоўвала такія прафесійныя і чалавечыя якасці, як стрыманасць, адказнасць, цярплівасць. Атрымала каласальны вопыт!

Хоць «сіл на кіно не хапала», але ўсё ж такі каманда сэрвіснага атрада паспявала атрымліваць пазітыўныя эмоцыі не толькі ад працы, але і ад адпачынку. «Часам увечары ў выхадныя дні гулялі ў спартыўныя гульні, прагульваліся па парку і наведвалі тэатр», — успамінае гераіня.

Дар'я прызнаецца: паміж студэнцкімі атрадамі звычайна пануе дух канкурэнцыі, які матывуе на далейшую работу над сабой.

— Штогод на розных мерапрыемствах сустракаемся з іншымі камандамі, і кожная хоча паказаць сябе з найлепшага боку. Аднак заўсёды ёсць месца і сяброўству. Напрыклад, летась на традыцыйным злёце «Час руху» мы спявалі разам на працягу прыкладна шасці гадзін — было весела!

Дзяўчына расказвае, што яе вопытам работы ў студэнцкім атрадзе зацікавіліся аднагрупнікі і знаёмыя. Хоць некаторыя дагэтуль не разумеюць, «як можна выбраць працу летам замест адпачынку»...

— На такія каментарыі не звяртаю ўвагі, проста раблю тое, што падабаецца. Галоўнае, што мяне падтрымліваюць бацькі. Многія са студэнтаў ідуць у атрад, каб падзарабіць. Але пасля таго, як яны праходзяць хоць праз адзін працоўны семестр, пачынаюць разумець, што атрымліваюць нашмат больш. Гэта і новыя знаёмствы, і развіццё сваіх здольнасцяў... Таму кажу хлопцам і дзяўчатам: усе дзверы адчынены, галоўнае — не сядзець на месцы!

Увогуле лічу, што жыццёвы вопыт трэба набываць як мага раней, і студэнцтва для гэтага вельмі падыходзіць. Цяпер атрымліваю паралельна дзве адукацыі — тэхнічную і эканамічную, у нашым універсітэце ёсць такая магчымасць. Спадзяюся, летам сітуацыя з каранавірусам зменіцца ў лепшы бок, і тады змагу паехаць у складзе студэнцкага вытворчага атрада ў якасці камандзіра на «Атлант». Цікава паспрабаваць свае сілы і ў гэтым кірунку, — падзялілася дзяўчына.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіва гераіні.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Знайсці сябе

# РАБОТА З ВОДАРАМ КАВЫ



**У дзевятнаццаць гадоў Ігнат МЯХЕДКА — ужо ўладальнік адной са сталічных кавярняў. Ён не толькі кіруе бізнесам, але і сам праводзіць будні за барнай стойкай. А пачалося ўсё з таго, што ў чатырнаццаць хлопец вырашыў стаць больш самастойным і зарабляць уласныя грошы. Для ажыццяўлення свайго плана пайшоў падпрацоўваць у велакраму. Калі суразмоўніку споўнілася шаснаццаць гадоў, ён зразумеў: больш за ўсё яму даспадобы індустрыя кавы. Таму пачаў атрымліваць вопыт у гэтай сферы ў шматлікіх кава-пойнтах горада (міні-кавярнях, якія маюць фармат «кавы з сабой»).**

— Каб прайсці прафесійнае навучанне, былі патрэбны вялікія грошы, якіх я тады не меў. А работа барыста ў сталічных кававых пунктах давала магчымасць «набіць руку», даведацца пра яе асаблівасці. Акрамя таго, я знаходзіў час для навучання ў Specialty coffee association (прафесійная арганізацыя, якая збірае перадавы вопыт і аб'ядноўвае вядучых спецыялістаў. — *«Аўт.»*). Сёлета мне пашчасціла стаць сертыфікаваным трэнерам гэтай міжнароднай асацыяцыі кавы, — расказвае хлопец.

Калі Ігнату споўнілася васямнаццаць, ён задумаўся над тым, каб адкрыць сваю першую кавярню.

— Гэта аказалася для мяне і маёй каманды цяжкім выпрабаваннем, мы нарабілі шмат памылак. Не «пацягнулі» арэнду памяшкання, і даваліся закрыць установу ўжо праз некалькі месяцаў. Але паабяцалі сабе не спыняцца. Паўгода прадумвалі новую канцэпцыю праекта, столькі ж пайшло на яго рэалізацыю. Для мяне было важна зрабіць кавярню, адметную ва ўсім: з якаснымі напоямі, прафесійнай камандай, стыльным інтэр'ерам, — працягвае суразмоўнік.

Хлопец лічыць, што ні адзін праект не можа добра функцыянаваць без згуртаванага калектыву. Дарэчы, свой ён стварыў са знаёмых:

— Чатыры супрацоўнікі, якія працуюць за барнай стойкай, прыблізна аднаго ўзросту. Мы, маладыя і захопленыя, лічым адно аднаго сябрамі. У развіцці дапамагае шмат іншых спецыялістаў — фатографаў, перакладчыкаў, маркетолагаў. Наша агульная мэта — зрабіць так, каб наведвальнікі былі задаволеныя.

Суразмоўнік прызнаецца: яму падабаецца прыходзіць у кавярню за паўгадзіны да адкрыцця а палове восьмай і сыходзіць з апошнім кліентам у 23 гадзіны.

— На жаль, цяпер у мяне няма столькі часу працаваць за барнай стойкай, колькі было раней. Я ўласнік, таму павінен вырашаць шматлікія пытанні. Але мяне вельмі цягне да таго, каб радаваць гасцей добрай кавай, размаўляць з імі пра гэты напой, адкрываць для іх штосьці новае. Вы можаце знайсці мяне на рабочым месцы і ў выхадныя, і ў святочныя дні. Бывае, прымушаю сябе адключыцца ад усяго дзелавога, але ў такія моманты не атрымліваю задавальнення. Можна сказаць, што я працаголік. Адзінае, што мяне цягне дадому, — гатаванне. Люблю прысвячаць гэтаму захапленню хоць нейкі час.

***— Што параіш маладым хлопцам і дзяўчатам, якія хочуць адкрыць сваю справу?*** — пытаюся ў Ігната.

— Можа, скажу банальную рэч, але не марнуйце час, седзячы на канапе за праглядам серыялаў або за камп'ютарнымі гульнямі. Памятайце, што не кожны можа стаць кіберспартсменам! *(усміхаецца).* Трэба шукаць тую сферу дзейнасці, якая цікавая менавіта вам, і паглыбляцца ў яе з галавой. Не звяртайце ўвагу на меркаванне іншых, на стомленасць — пераступайце праз усё, ганіце прэч негатыўныя думкі. Спрабуйце сілы ў розных кірунках, памыляйцеся, але набірайцеся карыснага вопыту.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# ЗАХОПЛЕНЫ... ДЫНАЗАЎРАМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— У той час я завёў сяброў па перапісцы з іншых краін, ды і ўвогуле з'явілася шмат новай карыснай інфармацыі, якая дапамагла сістэматызаваць атрыманыя раней веды пра дыназаўраў. Чым больш даведваўся, тым больш захапляўся тэмай, — кажа навуковец.

Цяпер свае ілюстрацыі Дзмітрый стварае як на паперы, так і на камп'ютары. Суразмоўнік расказвае, што для таго, каб намаляваць адну невялікую карцінку, неабходны дзве-тры гадзіны, а вялікая можа запатрабаваць старання на некалькі тыдняў.

Дзмітрый прызнаецца, што найцяжэй яму даводзіцца з малюнкамі тыраназаўраў.

— Пра гэты від шмат што вядома, таму адлюстраванне патрабуе максімальнай дакладнасці. Але ёсць некалькі спрэчных момантаў, якія нават прафесійных палеантолагаў ставяць у тупік. Пашча тыраназаўра была як у яшчара або як у кракадзіла? У які момант знікла апярэнне? Справа ў тым, што ў продкаў тыраназаўра яно дакладна было. Таму калі малюю гэты від зусім без пер'я, у некаторых іншых ілюстратараў часам узнікае незадавальненне. Калі ж я далучаю рэшткі апярэння, таксама паўстаюць пытанні, навошта.

**Дзмітрый прызнаўся, што хацеў бы пабываць на раскопках, дзе знаходзяць парэшткі дыназаўраў. Суразмоўніку застаецца толькі спадзявацца на ўдачу.**

Навуковец дастае свае малюнкі і з захапленнем паказвае найцікавейшыя адкрыцці ў свеце вымерлых жывёл на паперы...

Сярод ілюстратараў і мастакоў штогод з'яўляецца новая зацікаўленасць пэўнымі відамі дыназаўраў. Напрыклад, з выхадам вядомага серыяла «Парк юрскага перыяду» гэтых жывёл пачалі ўяўляць актыўнымі і дастаткова разумнымі. Таксама інтарэс да некаторых відаў з'явіўся пасля адкрыцця ў іх апярэння.

— Раней, напрыклад, раптараў малявалі калматымі, месцамі з луской, месцамі з пер'ем. Цяпер выявы дыназаўраў сталі больш «гладкія», рэалістычныя. Яны ўжо не нагадваюць старажытных монстраў.

Летась адну з работ Дзмітрыя пад назвай «38 адкрытых у 2018 годзе відаў дыназаўраў» апублікаваў National Geographic (Расія), што вельмі крута для ілюстратара-аматара. Як гэта было?

— Некалькі гадоў таму я браў удзел у чэленджы Dinovember, у рамках якога розныя мастакі і ілюстратары штодзень павінны былі маляваць і публікаваць па адной выяве дыназаўра. Я праходзіў яго другі раз. Каб зрабіць сваю работу больш канцэптуальнай, вырашыў адлюстраваць дыназаўраў, адкрытых у свеце на працягу 2018 года. Такім чынам стаў першапраходцам у гэтым. Ілюстрацыі набылі пэўную папулярнасць, менавіта дзякуючы ёй на мяне выйшаў Андрэй Журавлёў, навуковы рэдактар National Geographic (Расія), — расказвае навуковец.



Дарэчы, цяпер мастак працуе над другім цыклам работы, які прысвечаны дыназаўрам, адкрытым ужо ў 2019 годзе:

— Працэс іх малявання адрозніваецца. Летась дыназаўраў было адкрыта нашмат больш, чым у 2018-м — 48 супраць 38 відаў, таму вырашыў падзяліць спіс на дзве катэгорыі і частку зрабіць у алоўкавай тэхніцы, а частку — тушшу. Пакуль работа выканана напалову, спадзяюся завяршыць яе да канца гэтага года.

**«Раней, напрыклад, раптараў малявалі калматымі, месцамі з луской, месцамі з пер'ем. Цяпер выявы дыназаўраў сталі больш «гладкія», рэалістычныя».**

***— На што арыентуецеся, калі недастаткова навуковай інфармацыі для стварэння рэалістычнага малюнка?***

— Калі працую над ілюстрацыяй малавывучанага дыназаўра, ад якога застаўся толькі фрагментарны матэрыял, звяртаю ўвагу на яго найбліжэйшых сваякоў — паказчыкі будуць падобныя для аднаго сямейства або падсямейства. А ўвогуле трэба прытрымлівацца ведаў з вобласці анатоміі і філагеніі (навука аб родных сувязях). Да таго ж заўсёды ёсць месца для невялікіх творчых вольнасцяў: можна выбраць, у якім парадку і ў якой колькасці зрабіць зморшчыны на целе жывёлы, або самому вызначыць напрамак яе апярэння. Каб удасканальваць свае веды і навыкі, сачу за навуковымі навінамі на рускай і англійскай мовах, з'яўляюся прыхільнікам работ многіх прафесійных замежных і айчынных палеаілюстратараў. Сярод апошніх вельмі падабаецца Андрэй Атучын, з яго работамі выходзяць серыі кніг, у тым ліку і на рускай мове, іх я таксама калекцыяную.

**«Заўсёды ёсць месца для невялікіх творчых вольнасцяў: можна выбраць, у якім парадку і ў якой колькасці зрабіць зморшчыны на целе жывёлы».**

Дзмітрый прызнаўся, што хацеў бы пабываць на раскопках, дзе знаходзяць парэшткі дыназаўраў. Але, як правіла, яны адбываюцца ўдалечыні ад цывілізацыі, туды адпраўляюцца рэдкія экспедыцыі з перыядычнасцю часам у некалькі дзясяткаў гадоў. Таму суразмоўніку застаецца толькі спадзявацца на ўдачу.

***— А ці ёсць у вас малюнкі дыназаўраў, якія жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі?***

— На жаль, гэтыя вымерлыя жывёлы ў нашай краіне пакуль не вельмі добра вывучаюцца, бо дагэтуль яны тут не былі знойдзены. Раней, падчас мезазою, большую частку тэрыторыі ў нас займала мора, але вядомая і нашмат ранейшая фаўна. Напрыклад, у салігорскай шахце ў 1976 годзе ўпершыню было знойдзена некалькі шкілетаў ракаскарпіёнаў палеазойскай эры і вызначаны іх новы від — салігорскаптэрус, названы ў гонар гэтага горада. Пазней падобныя парэшткі тут былі знойдзены яшчэ шэсць разоў, — расказвае суразмоўнік.

Галоўная мэта Дзмітрыя на найбліжэйшы час — удасканальваць свае навыкі малявання і не страчваць «запалу» творчасці ў душы. «Хобі, якое ператвараецца ў асноўную дзейнасць, можа паграцаваць выгараннем. Таму на сённяшні канцэнтрую сваю ўвагу на некалькіх маштабных праектах. Лічу, што маю яшчэ шмат нераскрытага патэнцыялу і ў будучыні абавязкова яго рэалізую».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

**Фота аўтара.**

**ЗВЯЗДА**

*Занятак па душы*

# «ІМПУЛЬС» ДЛЯ ТВОРЧАСЦІ

**Канстанціна ЯРАША ў Ашмянскім раёне ведаюць многія, калі не асабіста, дык у твар дакладна. Малады чалавек працуе ў раённым цэнтры культуры і з'яўляецца салістам народнага тэатра танца і песні «Імпульс». Родам ён з Расіі, але дзяцінства і юнацтва правёў у Калінкавічах, вучыўся ў Магілёве, а цяпер жыве і працуе ў Ашмянах.**



Косця нарадзіўся ў горадзе Кацельніч Кіраўскай вобласці. Шмат часу праводзіў у Ніжнім Ноўгарадзе, куды ездзіў да бабулі з дзядулем. У 1996-м з бацькамі пераехаў у Беларусь, у Калінкавічы, на радзіму бацькі.

Са школы ў хлопца пачаліся выступленні, потым была раённая сцэна, затым прыйшоў перыяд падарожжаў і перамен: збіраўся паступаць у навучальную ўстанову ў Брэсце, у Мазыры, але ў выніку апынуўся ў Магілёве. Па размеркаванні Косця хацеў трапіць у Віцебск, але гэты горад ужо «забралі». Акрамя Ашмян, усе астатнія варыянты былі ў сельскай мясцовасці. Так юнак і апынуўся тут.

***— Але ж па прафесіі ты бібліятэкар? Чаму вырашыў вучыцца гэтай справе і як потым трапіў ва ўстанову культуры?***

— Рашэнне было прынята выпадкова. Спачатку хацеў паступаць на псіхолага, але для бюджэтнай формы навучання не дабраў патрэбнай колькасці балаў. Таксама разглядаў варыянт стаць кухарам-кандытарам, але ў выніку перадумаў. Спыніўся на бібліятэчнай справе. Прычына простая: на той момант старэйшы брат вучыўся ў Магілёве.

У сферы культуры суразмоўнік апынуўся таксама цалкам выпадкова. Падчас вучобы ён іграў у рок-гурце. Па прыездзе ў Ашмяны паўтара года творчасцю не займаўся, але аднойчы сябе рассакрэціў. «Мяне заўважылі работнікі РДК Марына Паўлаўна Шурбак і Марына Ягораўна Варановіч. Імі была вымаўлена адна кароткая фраза: «Ты папаў, Косцік!» З тых самых часоў хлопец, па яго ўласным прызнанні, і апынуўся ў сваёй каляіне.



***— А якой запомніў працу ў бібліятэцы?***

— Не такой сумнай і руціннай, як думаюць многія. Насамрэч, фронт работы там больш маштабны, чым многія сабе ўяўляюць. Мне пашанцавала як на першым месцы, у гарадской бібліятэцы, так і на другім — у аддзеле камплектавання. Калектыў быў выдатны.

Цяпер хлопец працуе галоўным адміністратарам, у яго абавязкі ўваходзіць рэкламная дзейнасць арганізацыі. Акрамя гэтага, Канстанцін удзельнічае ў творчым жыцці раёна, выступаючы на святах і мерапрыемствах. А як адпачывае? Кажа, што найлепшы занятак для яго — пабыць дома ў асяроддзі... катоў, якіх у нашага суразмоўніка аж два. Вольнага часу вельмі мала, аднак калі той знаходзіцца — усё ідзе на творчасць, кажа хлопец.

У Косці пашпарт грамадзяніна Расійскай Федэрацыі, але часам ён думае, што куды прасцей было б жыць у краіне менавіта з беларускім, таму задумваецца пра змену грамадзянства. «Наколькі ведаю, гэта не вельмі складана, трэба будзе паспрабаваць. Я знаёмы з гісторыяй Беларусі, ведаю мову, культуру, звычаі ды традыцыі. Мне падабаецца краіна і людзі, якія мяне акаляюць. А прырода проста заваrожвае! І я ганаруся, што жыву менавіта тут!» — прызнаецца Канстанцін.

**Інга ГІЗ.**
**Фота Святланы МУЦЯНСКАЙ.**



*Друкуецца ў «Маладосці»*

**Аўтар — гісторык і літаратар, стваральнік і адміністратар гісторыка-асветніцкага інтэрнэт-праекта «Свісляцкія аркушы — Кастусь Каліноўскі», пераможца II тура конкурсу біяграфічных твораў «Слаўная кампанія: рэANIMAцыя», арганізаванага рэдакцыяй часопіса «Маладосць» і кафедрай тэарэтычнага і славянскага літаратуразнаўства філфака БДУ. Конкурс прысвечаны беларускім пісьменнікам XIX стагоддзя, у ліку якіх — Кастусь Каліноўскі. Дзмітрый Кузьменка напісаў пра яго апавяданне пад назвай «Шалгуноў», — урывак з якога «Маладосць» прапанавала «Чырвонцы. Чырвонай змене».**



Шалгуноў меўся жорстка паставіць арыштанта на месца, але чамусьці не знайшоў патрэбных слоў. Упершыню за сваю кар'еру ён не ведаў, што сказаць. Балазе тое вымушанае маўчанне доўжылася ўсяго імгненне, і ніхто ў зале нічога не заўважыў.

— Хто яшчэ, апрача вас, выношваў вар'яцкія ідэі гэтай... беларускай самастойнасці? — пачуўся голас штабс-капітана Сямёнава.

— Ігнат Здановіч, Ціт Далеўскі...

— О! Пра гэтых мы ўжо наслухаліся! — прамармытаў Гогель, быццам сабе пад нос. Але так, што пачуў кожны.

— Яшчэ? — запытальна секануў Сямёнаў.

Канстанцін павярнуўся да следчага і цвёрда прамовіў:

— Імёны астатніх я назваць не магу.

Ужо не аднойчы бывала раней. Ударыла іх саміх, следчых.

Ніхто з арыштантаў дагэтуль не гаварыў з імі так, быццам ад іх не залежала пытанне яго жыцця або смерці. Ніхто не насмельваўся спрачацца з імі. Ніхто столькі не хаваў ад іх і адначасна не казаў ім проста ў вочы столькі праўды.

— У такім разе, — Павел Шалгуноў на секунду запнуўся, — не бачу сэнсу болей вас тут затрымліваць.

У грудзях перахапіла дыханне: ці то ад гневу, ці то ад здзіўлення. А можа, і ад аднаго і ад другога разам. Двойчы за нейкую чвэрць гадзіны добра пастаўлены голас вайсковага камандзіра адмовіў яму. Ён мусіў сказаць штосьці іншае: паказаць сваю ўладу і заўсёднае вяршэнства пераможцы над пераможаным. Але падсвядомасць здолела выштурхнуць на паверхню толькі адну банальную дзяжурную фразу.

Дзмітрый КУЗМЕНКА

# ШАЛГУНОЎ

*Урывак*

— Дваранін Каліноўскі! Вы пацвярджаеце свае заручыны з Марыяй Ямант? — зноў узвысіў голас Шалгуноў.

— Я ўжо сказаў вам, што не ведаю гэтую жанчыну.

— У такім разе назавіце прозвішча той, для каго пісалі верш.

— І выдаць вам на паглум ні ў чым не вінаватага чалавека? — арыштант абвёў камісію грэблівым позіркам. — Тое, што вы ад мяне патрабуеце, панове, супярэчыць маім перакананням. Мяне з дзяцінства вучылі, што шпіёнства апаганьвае чалавека. Яшчэ раз паўтараю: даносчыкам я не буду. І прымусіць мяне да гэтага вы не можаце.

— І не такіх герояў прымушалі! — выразна працадзіў скрозь зубы Гогель.

— Я прасіў бы вас, паручнік, устрымацца ад падобнага роду заўваг, — абсек малодшага калегу Шалгуноў. Павярнуўшыся да Каліноўскага, ён строгім афіцыйным тонам, у якім чуліся настылыя ноткі казённай пагрозы, адчаканіў:

— Вікенцій Каліноўскі, ці азначае ваша апошняя заява, што вы рашуча адмаўляецеся даваць следчай камісіі сапраўдныя паказанні пра сваіх саўдзельнікаў і тым самым канчаткова адмаўляецеся супрацоўнічаць са следствам?

— Так. Я лічу магчымым гаварыць тут толькі пра свае ўласныя дзеянні і ўчынкі.

— Ці разумееце вы наступствы свайго рашэння?

Суровая пагрозлівасць адкрыта вырвалася з-пад знешняга покрыва ветлівасці і добрапрыстойнасці. Пастка зачынілася. Дакладней, зачынілася яна даўно. Цяпер была закладзена апошняя невялікая адтуліна, якая злучала яе задушлівае нутро з вольным светам. Праз якую няхай з цяжкасцю, але прабівалася сонечнае святло і свежае паветра. У розных сітуацыях гэткая фраза пра наступствы можа азначаць розныя рэчы. Але ў кожным выпадку яна не абяцае нічога добрага. Тут — за ёй стаяла немінучая смерць: на эшафоце ці каля расстрэльнага слупа. На вачах сотняў мясцічаў.

Канстанцін адказаў не адразу. Нейкі час ён моўчкі глядзеў у вочы палкоўніку, а затым з цвёрдым спакоем вымавіў:

— Так, панове... Усе наступствы мне вядомыя і добра абдуманыя. Але выхаванне і ўсведамленне таго месца, якое я займаў у грамадстве, не дазваляюць мне ісці іншым шляхам.

Паветра ў зале было наэлектрызаванае да апошняй ступені. І, нарэшце, адбыўся разрад. Але ўдарыла громам не таго, каго яны допытвалі, як

Калі двое зусім маладзенькіх салдат вывелі Каліноўскага з залы, ніхто з членаў камісіі не паварушыўся. Здавалася, у гэтых старадаўніх мурах спыніўся час. Але так толькі здавалася. Першы ачомаўся Гогель. Прамармытаўшы сабе пад нос нейкую непрыстойнасць, ён шчыльна зашпіліў каўнер, развітальна кіўнуў усім прысутным галавой і падаўся да выхаду.

— Паручнік Гогель, застаньцеся! — запыніў яго Шалгуноў. — Усе астатнія могуць быць вольныя.

Адзін за адным члены камісіі пакідалі залу. Сыходзячы, обер-аўдытар Шчэрба хацеў прыбраць раскіданыя на стале паперы. Але палкоўнік жэстам загадаў пакінуць усё як ёсць. Нарэшце яны з паручнікам засталіся ўдвох.

Шалгуноў устаў з-за стала і падышоў да супрацьлеглай сцяны, каля якой стаяў Гогель.

— Паручнік, мой абавязак папярэдзіць вас: калі вы не зменіце свае паводзіны падчас допытаў, я буду змушаны паставіць перад вышэйшым начальствам пытанне пра вашу неадпаведнасць месцу следчага.

— І чым жа ваша высокаблагароддзе не задавальняюць мае паводзіны? — Гогель гаварыў дзёрска, з выклікам.

— Не забывайцеся, — палкоўнік стрымаў раздражненне, — што размаўляеце са старшым па званні. Ваша нястрыманасць і хамства не толькі перашкаджаюць весці допыт, але і лішне настройваюць арыштантаў супраць камісіі. Вы адкрыта выклікаеце гатовых супрацоўнічаць!

— Тыя, што гатовыя супрацоўнічаць, будуць супрацоўнічаць яшчэ лепш. Добрая порцыя страху гэтым бандытам не зашкодзіць. Асабліва такім, як гэты, — Гогель кіўнуў галавой на дзверы, за якімі некалькі хвілін таму знік Каліноўскі. — З імі трэба працаваць як належыць, а не валаводзіцца.

— Па-вашаму, працаваць як належыць — гэта пагражаць расправай з іншым чалавекам і заўчасна выдаваць таямніцы следства? Хто вас, выбачайце, цягнуў за язык чытаць яго вершык? Хто дазволіў згадваць імя Марыі Ямант? Ды яшчэ ў такім ключы?!

— Я амаль зламаў яго, — узвысіў голас Гогель. — Ён бы ў мяне заспяваў, каб... Каб не ваша заступніцтва...

— Захоўвайце субардынацыю! — раўнуў Шалгуноў.

— О, прашу прабачэння! — з'едліва сказаў паручнік трохі цішэй. — Я не падумаў, што вы хочаце перацягнуць гэтага бунтаўшчыка на наш бок.

— Не крыўляйцеся, Гогель!.. Такія, як ён, сапраўды маглі б быць карысныя...

## ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении первых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ОАО «Центрторгуслуги» (УНП 700379305, г. Бобруйск, ул. Западная, 34), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

***Дата и время проведения торгов***: **22 мая 2020 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются **с 07 мая 2020 года по 21 мая 2020 года.**

***Место проведения торгов:*** Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41.

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:*** ОАО «Центрторгуслуги» (УНП 700379305), в лице антикризисного управляющего – директора частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, руб. | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-55361, площадь – 282,6 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – общественный туалет, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 172Г/1 на земельном участке с кадастровым номером 741000000001000064 площадью 2,7284 га – 15 816,98 руб. без учета НДС<br>Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-55360, площадь – 45,5 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – здание «Помещение охраны», расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 172Г на земельном участке с кадастровым номером 741000000001000064 площадью 2,7284 га – 2 858,49 руб. без учета НДС | 18 675,47 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п.2 ст. 115 НК РБ) | 5 % | 5 % |
| 2 | Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-41912, площадь – 81,1 кв. м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – торговый объект, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Парковая, 61Б на земельном участке с кадастровым номером 741000000008000215 площадью 0,0098 га | 46 498,10 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п.2 ст. 115 НК РБ) | 5 % | 5 % |
| 3 | Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-1537, площадь – 391,8 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – гаражи, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Западная, 34А/1 на земельном участке с кадастровым номером 741000000003000054 площадью 0,4052 га – 22 486,79 руб. без учета НДС<br>Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-1536, площадь – 909,6 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – производственный корпус ритуальных принадлежностей, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Западная, 34А на земельном участке с кадастровым номером 741000000003000054 площадью 0,4052 га – 131 490,54 руб. без учета НДС | 153 977,33 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п.2 ст. 115 НК РБ) | 5 % | 5 % |

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок до 17.00 **21 мая 2020 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».
2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 17.00 21.05.2020 (за день до торгов) заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».
3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.

Сведения о предыдущих торгах: РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 29 (29143) за 13.02.2020

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 450/С-18476 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), общей площадью 191,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Ружанская, 8.

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 425450100001006060, площадью 0,0346 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: г. Слоним, ул. Ружанская, 8.

Обременения со стороны 3 лиц:
- подлежит реализации под контролем Отдела принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Гродненского облисполкома;
- в виде аренды: площадью 185,9 кв. м и 16,24 кв. м сроком до 31.10.2020 г.

Начальная цена продажи – 204 000 руб. (двести четыре тысячи) с учетом НДС. Сумма задатка – 2 040 руб. (две тысячи сорок рублей)

**Продавец – открытое акционерное общество «Белая ромашка», 231792, г. Слоним, ул. Коссовский тракт, 100, тел. 8-01562-630-29**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия проведения аукциона:
- срок подписания договора купли-продажи 10 рабочих дней с даты проведения аукциона;
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 3 % от конечной цены продажи объекта.

Условия оплаты – по договоренности сторон.

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 21 мая 2020 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 13.03.2020 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 19 мая 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/**

## Ликвидатор торгового унитарного предприятия «Обухово-Сервис» Вакульчик И.А. – организатор торгов сообщает о проведении ТОРГОВ по продаже имущества ТУП «Обухово-Сервис»

**№ ЛОТА 1**

**Наименование лота, его местонахождение:** Полуприцеп платформа, MAZ 938662, 2010 г. в., VIN Y3M938662A0010309., Гродненский район, д. Обуховичи.

**Начальная цена продажи лота:** 4593,60 рубля (с НДС).

**Сумма шага аукциона:** 229,68 рубля (5 % от начальной цены).

**Размер и порядок внесения задатка:** Задаток: 229,68 рубля (5 % от начальной цены).

**№ ЛОТА 2**

**Наименование лота, его местонахождение:** Седельный тягач MAZ 6430A5-320-010, 2011 г. в., VIN Y3M6430A5B0000201, Гродненский район, д. Обуховичи.

**Начальная цена продажи лота:** 25697,60 рубля (с НДС).

**Сумма шага аукциона:** 1284,88 рубля (5 % от начальной цены).

**Организатор торгов**: ликвидатор ТУП «Обухово-Сервис», Вакульчик И.А.

**Размер и порядок внесения задатка:** Задаток: 1284,88 рубля (5 % от начальной цены).

**№ ЛОТА 3**

**Наименование лота, его местонахождение:** Седельный тягач MAZ 642205, 2010 г. в., VIN Y3M642205A0003113, Гродненский район, д. Обуховичи.

**Начальная цена продажи лота:** 15987,20 рубля (с НДС).

**Сумма шага аукциона:** 799,36 рубля (5 % от начальной цены).

**Организатор торгов**: ликвидатор ТУП «Обухово-Сервис», Вакульчик И.А.

**Размер и порядок внесения задатка:**
Задаток: 799,36 рубля (5 % от начальной цены).

**Продавец по всем лотам:**
ТУП «Обухово-Сервис», тел. 8 (029) 3667568, тел./факс 8 (0152) 393313.

**Организатор торгов**: ликвидатор ТУП «Обухово-Сервис», Вакульчик И.А.

**Дата, время, место и форма проведения торгов по всем лотам:**
Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

**Торги состоятся 18.05.2020 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Лелевеля, 12-32.**

Срок возможного отказа от проведения торгов – до 17.05.2020.

***До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: р/с BY33AKBB30120042101714000000 в ОАО «АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 500504988, ТУП «Обухово-сервис».***

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридического лица – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления до 12.00 17.05.2020 по адресу: 230001, г. Гродно, а/я, 26 или по факсу 8 (0152) 393313, а также по электронной почте: i.vakuchik1991@mail.ru.

Победитель торгов либо в случае, когда предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов, возмещает затраты, связанные с организацией и проведением торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки. Договор купли-продажи предмета торгов заключается с победителем не позднее 10 дней со дня проведения торгов.

Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником возможна продажа предмета торгов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Получить полную информацию о порядке и условиях проведения торгов, о предмете торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно, ул. Лелевеля, 12-32, тел. 8 (029) 3667568, тел./факс 8 (0152) 393313. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 с предварительным согласованием даты и времени.

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении повторных электронных торгов**

### по продаже имущества МОАО «Красный металлист» (Продавец)

**Лот № 300420001:** здание компрессорной, инв. № 700/С-48513, 234 кв. м. Обременение: аренда. Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. – 36 720,00. **Лот № 300420002:** здание зарядной аккумуляторов, инв. № 700/С-48508, 424 кв. м. Обременение: аренда. Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. – 39 000,00. **Лот № 300420003:** здание склада ГСМ, инв. № 700/С-48482, 266 кв. м. Обременение: аренда. Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. – 25 200,00. **Лот № 300420004:** склад, инв. № 700/С-8158, 428 кв. м. Обременение: аренда. Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. – 42 660,00. **Лот № 300420005,** состав: 1. Склад металлов, инв. № 700/С-8163, 718 кв. м. 2. Здание «Канск», инв. № 700/С-8164, 192 кв. м. Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. – 85 140,00. Адрес лотов: г. Могилев, ш. Гомельское, 15А. Земельный участок: кадастровый номер 740100000007004614, 6,0972 га. Аукцион состоится **22.05.2020 с 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Извещения о проведении электронных торгов размещено на ЭТП «ТОРГИБЕЛ».

**☎ Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • www.торги.бел • e-mail: torgi@ino.by**

## К сведению акционеров ОАО «Красный Октябрь»

Очередное общее собрание акционеров, не состоявшееся в связи с эпидемиологической обстановкой, состоится 28 мая 2020 года в 11.00 по адресу: г. Витебск, проспект ген. Людникова, 10/3 с повесткой дня и процедурой проведения ранее опубликованными.

УНП 300003144

*Директор ОАО «Красный Октябрь»*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

### Организатор АУКЦИОНА: Голоцкий сельский исполнительный комитет, Минская область, Пуховичский район, аг. Голоцк, ул. Центральная, 11, тел.: 8 (01713) 94689, 68636, 66899.

Дата проведения ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА: 22 мая 2020 года в 09.00

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного участка, *га* | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена, *руб.* | Задаток, *руб.* | Расходы по подготовке, *руб.* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | (ПОВТОРНО) Минская область, Пуховичский р-н, д. Лысовщина, ул. Светлая | 624482502601000128 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1041 | Сети электроснабжения газоснабжения | 7844,98 | 784,50 | 1597,69 + стоимость объявления в СМИ |
| 2 | (ПОВТОРНО) Минская область, Пуховичский р-н, д. Лысовщина, ул. Шоссейная | 624482502601000119 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1125 | Сети газоснабжения | 7630,20 | 763,00 | 1526,65 + стоимость объявления в СМИ |
| 3 | (ПОВТОРНО) Минская область, Пуховичский р-н, д. Кодуново, ул. Ягодная | 624482502101000050 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1497 | Сети электроснабжения | 4056,87 | 405,70 | 1618,77 + стоимость объявления в СМИ |
| 4 | (ПОВТОРНО) Минская область, Пуховичский р-н, д. Лешница | 624482502401000275 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1231 | Сети электроснабжения | 6881,29 | 688,10 | 1646,99 + стоимость объявления в СМИ |

**Задаток для участия в открытом аукционе перечисляется** на расчетный счет № BY11AKBB36006250500040000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код банка AKBBBY2X, МФО 153001795, УНП 600177877, ОКПО 04431027, код платежа 04901, Голоцкий сельский исполнительный комитет.

**Срок внесения задатка –** до подачи заявления на участие в открытом аукционе. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в аукционе. **Окончание приема заявлений на участие в открытом аукционе** с прилагаемыми к ним документами – **18 мая 2020 года, до 17.00.**

Лицо, желающее принять участие в открытом аукционе в отношении нескольких земельных участков (далее – предметов торгов), вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов торгов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.00–13.00, 14.00–17.00).

Открытый аукцион проводятся в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведении аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель открытого аукциона обязан:

возместить затраты на организацию и проведение открытого аукциона;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

внести плату за земельный участок, продаваемый в частную собственность.

После совершения победителем открытого аукциона указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых **домов подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с ПОСТАНОВЛЕНИЕМ Совета Министров Республики Беларусь 1 апреля 2014 г. № 298 «Об утверждении положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку».

# О реализации имущества частного предприятия «Транспортное бюро»

**Сведения об организаторе торгов:** ООО «Госпромсервис»: 210015, г. Витебск-15, а/я 71, тел. +375 (33) 379 18 88

**Продавец**: частное предприятие «Транспортное бюро» (Витебская обл., Оршанский р-н, Устенский с/с, аг. Устье, д. 24, к. 4, УНП 391700177, тел. +375 (29) 604-08-89)

**Форма, дата, время и место проведения торгов:** вторые повторные торги с повышением начальной цены в форме аукциона по реализации транспортных средств частного предприятия «Транспортное бюро» будут проводиться **19.05.2020 и длятся 1 (один) день (с 09.00 до 16.00) на электронной торговой площадке по адресу: promtorgi.by**

**Сведения о предмете торгов, начальная цена предмета торгов:** всего сформировано 3 лота с понижением начальной (оценочной) стоимости на 30 (тридцать) процентов. Начальная цена предмета торгов по каждому лоту указана без учета НДС. **Продавец освобожден от уплаты НДС в соответствии с действующим законодательством.** Имущество принадлежит продавцу на праве хозяйственного ведения

| Наименование | Начальная цена за один лот, руб. | Размер задатка 10 %, руб. | Шаг аукциона 5 %, руб. |
|---|---|---|---|
| **Лот 1:** грузовой фургон тентовый MAN 8-224, кузов № WMAL34ZZZYG144573, рег. № AI 6670-2, 1999 г. в. | **12 600,00** | **1 260,00** | **630,00** |
| **Лот 2:** грузовой фургон тентовый MAN 8-224, кузов № WMAL34ZZZYG144550, рег. № AI 6669-2, 1999 г. в. | **9 800,00** | **980,00** | **490,00** |
| **Лот 3:** прицеп-фургон тентовый IN.PROIZV HWTPAS1383, кузов № W09TPS213X0H49413, рег. № A6268A-2, 1999 г. в. | **2 660,00** | **266,00** | **133,00** |

**Осмотреть имущество, расположенное**: **лот № 1 и лот № 2** в Витебской обл., г. Орша, ул. Марата, 111а, **лот № 3** – Витебская обл., г. Орша, ул. 1-го Мая 129а, можно в любое время по предварительной договоренности с организатором торгов и (или) продавцом (собственником имущества). **Контактное лицо для осмотра имущества:** Кудряшов Алексей Александрович, тел.: +375 (29) 717-70-10, +375 (29) 662-47-03

**Размер задатка для участия в торгах:** задаток в сумме 10 % от стоимости предмета торгов (лота) перечисляется до подачи заявления на расчетный счет организатора торгов – **ООО «Госпромсервис» BY60 PJCB 3012 2032 2210 0000 0933 в ЦБУ № 200 ОАО «Приорбанк», БИК PJCBBY2X, УНП 391856006**

**Сроки и место приема заявлений для участия в торгах и прилагаемых к ним документов:** заявления на участие в аукционе (электронных торгах), платежный документ о перечислении задатка с отметкой банка, копии свидетельства о государственной регистрации, учредительных документов, а также документов (приказа, доверенности), подтверждающих полномочия лица, подписавшего заявление, направляются по адресу: **210015, г. Витебск-15, а/я 71** и (или) по эл. почте: gospromservis@mail.ru, либо вручаются организатору торгов в рабочие дни, начиная с **08.00 07.05.2020** и заканчивая в срок не позднее **18.05.2020 до 17.00**. **Последний день внесения задатков (оплаты) – 18.05.2020 до 17.00. Условия аукциона: 1.** Победителем торгов будет объявлено лицо, предложившее наибольшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом. **2.** В случае признания торгов несостоявшимися в виду подачи заявления на участие только одним участником возможна продажа данного объекта заявившемуся участнику (претенденту на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. **3.** Победитель аукциона или единственный участник (претендент на покупку) возмещает продавцу (собственнику предмета торгов) на основании счета-фактуры: расходы по оплате вознаграждения поверенному (организатору торгов) в размере 3 % от конечной цены продажи предмета торгов (лота), фактические затраты по организации и проведению торгов в форме аукциона по каждому лоту в отдельности, в том числе по ранее проведенным нерезультативным, несостоявшимся торгам в течение 5 (пяти) календарных дней с даты проведения торгов. **4.** РЕЗУЛЬТАТЫ ТОРГОВ АННУЛИРУЮТСЯ В СЛУЧАЕ ОТКАЗА ИЛИ УКЛОНЕНИЯ ПОБЕДИТЕЛЯ (ПРЕТЕНДЕНТ НА ПОКУПКУ) ОТ: А) подписания протокола по результатам торгов в день их проведения и (или) договора купли-продажи в установленные сроки; Б) возмещения вознаграждения поверенному (организатору торгов), а также всех затрат, связанных с организацией и проведением торгов, указанных выше. **5.** Договор купли-продажи заключается в течение 5 (пяти) календарных дней с даты проведения аукциона. Победитель торгов (претендент на покупку) в течение 10 (десяти) календарных дней с даты проведения торгов оплачивает цену объекта аукциона за минусом суммы внесенного задатка. **6.** Участникам, не признанным победителями либо отказавшимся от участия в торгах, задаток возвращается в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты проведения аукциона, в том числе: а) юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям: в безналичной форме либо на карт-счет участника торгов за минусом суммы комиссионного вознаграждения, взымаемого банком; б) физическим лицам: на личный карт-счет участника торгов, а при отсутствии счета – денежным переводом через РУП «Белпочта», за минусом суммы комиссионного вознаграждения (почтового сбора). **Подробная информация размещена на сайте promtorgi.by**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский рыбокомплекс» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве Журова С.В. извещает о проведении 21 мая 2020 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 20 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | <u>**Условие продажи:**</u> **1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производятся Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** Лоты расположены на земельном участке с кадастровым номером **340100000002000638** площадью **2,0237 га** предоставлен ОАО «Гомельский рыбокомплекс» на праве постоянного пользования. После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя, в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельных участков**, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на покупателя. В связи с обеспечением возможности для каждого из образованных в результате раздела (выделения, деления) земельных участков беспрепятственных подъездов (подходов) для организации доступа к ним с целью содержания и обслуживания покупателями приобретенных зданий и сооружений в соответствии со ст. 268 ГК Республики Беларусь, ст.ст.19, 45 «Кодекса Республики Беларусь о земле» установить право ограниченного пользования чужим недвижимым имуществом (сервитут) на объекты недвижимости (земельные участки) через которые покупатели каждого из выставляемых на аукцион лотов после их приобретения имели бы доступ к ним с целью содержания и обслуживания приобретенных зданий и сооружений. **4.** В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 % | | | |
| | **Местонахождение лотов №№ 1–14:** Гомельская обл., Гомельский р-н, г. Гомель, ул. Шилова, д. 16 | | | |
| 1 | <u>**В составе:**</u> **капитальное строение с инв. № 350/С-51855**, общей площадью **201,1 кв. м,** назначение – здание административное, наименование – **одноэтажное кирпичное административное здание.** Здание административно-хозяйственное, холодная пристройка (инв. № 0003). Капитальное строение (инв. № 0004, № 0055, № 0054), общей площадью **167,3 кв. м,** наименование – **здание бойлерной.** Капитальное строение (инв. № 0007), общей площадью **111,0 кв. м,** наименование – **здание павильона ПК-24 (бытовки грузчиков)**. Капитальное строение (инв. № 0005), общей площадью **12,8 кв. м**, наименование – **здание проходной**. Склад ГСМ (инв. № 0025). Склад (инв. № 0032). Склад (инв. № 0031). Склад (инв. № 0035). Склад (инв. № 0024). Склад (инв. № 0030). Склад (инв. № 0028). Склад (инв. № 0027). Навес (инв. № 0033). Навес (инв. № 0029). ТУ (теплоузел 11, инв. № 0023). ТП (инв. № 0026). Гараж (инв. № 0036). Эстакада (инв. № 0037). Ворота (инв. № 1000). Ворота (1001). Ограждение мет. (инв. № 1001). Ограждение (забор кирпичный инв. № 1002). Проезжая часть (асфальтовое покрытие, инв. № 1008). Кондиционер Windair WRH-091NBE (инв. № 3449). Кондиционер Windair WRH-091NBE (инв. № 3448). Кондиционер Hyundai HSH-S241 NBE (инв. № 3450). Мини АТС (с телеф. аппаратурой 9 шт.) (инв. № 3241). Кондиционер Ballu BSR-0,9 H (инв. № 3330). Автомат ЭМ16 (инв. № 3237). Агрегат КМ-80-65-160 (инв. № 3336). Сигнализация (административное здание) (инв. № 3305). Сигнализация (магазин) (инв. № 3326). Сигнализация (склад) (инв. № 3303). Шкаф учета (инв. № 3323) | **984 920,00** | 49 246,00 | 98 492,00 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-51854**, общей площадью **897,9 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание санитарное обработки тары.** Линия очистных сооружений (инв. № 1005). Капитальное строение (инв. № 0006), общей площадью **30,0 кв. м,** наименование – **погреб-склад ГСМ** | **162 240,00** | 8 112,00 | 16 224,00 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 300/С-2574**, общей площадью **2 018,7 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание цеха по переработке рыбы.** Коптильный конвейер (инв. № 3120). Печь камерная (инв. № 3128). Печь камерная (инв. № 3143). Входной козырек (инв. № 3272). Агрегат компрессорный МС-Н8-ZB21KE-TFD (инв. № 3214). Агрегат компрессорный МС-Н8-ZB21KE-TFD (инв. № 3197). Агрегат компрессорный VC-Н8-ZB38KE-TFD (инв. № 3198). Вентилятор ВР80-75 2,5 (0,25/1500) (инв. № 3337). Вентилятор ВЦ 4/75 № 5 (инв. № 3242). Вентилятор ВЦ 4/75 № 2 (инв. № 3243). Камера холодильная 2000х3500х2240 (инв. № 3281). Теплообменник BLE 352 A70 E-S CF (инв. № 3212). Теплообменник BLE 352 A70 E-S CF (инв. № 3213). Теплообменник BLE 352 A70 E-S CF (инв. № 3215). Шкаф управления ЕС-Т9 (инв. № 3211). Шкаф управления ЕС-Т9 (инв. № 3223). Шкаф управления ЕС-Т9 (инв. № 3224). Шкаф ШР 8гр (инв. № 3244). ЩИТ ЩО-70 (инв. № 3015). Щит ЩО-59 (инв. № 3013). Эл. двигатель 5АМ S6-45/1000 (инв. № 3249). Распределительный пункт РП-04 (инв. № 3006). Трансформатор силовой ТМ-400 (инв. № 3009). Трансформатор силовой ТМ-400 (инв. № 3217) | **360 720,00** | 18 036,00 | 36 072,00 |
| 4 | Капитальное строение (инв. № 0008), общей площадью **949,9 кв. м**, наименование – **одноэтажное металлическое здание склада «Японское море»** | **131 200,00** | 6 560,00 | 13 120,00 |
| 5 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-75486**, общей площадью **2 721,1 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание холодильника.** Агрегат компрес-конденсат AK-4PCS10-Y-H-B2D1F1K1M1 (инв. № 3456). Агрегат компрес-конденсат AK-6H25-Y-H-AIB3D1F1M1 (инв. № 3457). Воздухоохладитель ВН 354Е 85 (инв. № 3460). Воздухоохладитель ВН 354Е 85 (инв. № 3461). Воздухоохладитель ВН 404Е 85 (инв. № 3462). Воздухоохладитель ВН 404Е 85 (инв. № 3463). Холодильный агрегат AM-2х6Н 25Y-CL-DK (инв. № 3176). Шкаф управления ЕВ2-18Е1.3 (инв. № 3458). Шкаф управления ЕВ2-25Е1.3 (инв. № 3459). | **396 240,00** | 19 812,00 | 39 624,00 |
| 6 | Термодымокамера УК-3 (камера коптильная) (инв. № 3206) | **2 160,00** | 108,00 | 216,00 |
| 7 | Теплосети (инв. № 2002) | **6 000,00** | 300,00 | 600,00 |
| 8 | **Автомобиль ГАЗ 3307 «КУПАВА»** 473800, год выпуска – 2008, рег. № АВ 6424-3, тип ТС – грузовой фургон-рефрижератор, удовлетворительное техническое состояние, цвет – белый. СКТР 25 терминал ON-LINE (инв. № 3341) | **5 840,00** | 292,00 | 584,00 |
| 9 | Смеситель для получения однородного рассола с насосом (инв. № 3339) | **1 520,00** | 76,00 | 152,00 |
| 10 | Машина разгрузочно-моечная МРМ Х940М (инв. № 3290) | **7 600,00** | 380,00 | 760,00 |
| 11 | Машина вакуум-упаковочная WEBOMATIK E15 (инв. № 3146) | **880,00** | 44,00 | 88,00 |
| 12 | Линия производства рыбных пресервов (инв. № 3196) | **2 240,00** | 112,00 | 224,00 |
| 13 | Котел пищеварочный КЭ-250 (инв. № 3210) | **696,00** | 34,80 | 69,60 |
| 14 | Котел пищеварочный КЭ-250 (инв. № 3209) | **696,00** | 34,80 | 69,60 |

<u>**Продавец:**</u> ОАО «Гомельский рыбокомплекс», г. Гомель, ул. Шилова, 16. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (044) 534-93-34, Петрушенко Михаил Михайлович, 8 (044) 733-03-49 управляющий в деле о банкротстве Журов Сергей Вячеславович. <u>**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо:**</u> **1.** Оплатить задаток на расчетный счет <u>**Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):**</u> р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 7 мая 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 19 мая 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на <u>**5 (пять) %**</u>. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение <u>**5 (пяти) рабочих дней**</u> со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, возместить затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение <u>**5 (пяти) рабочих дней**</u> с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение <u>**5 (пяти) календарных дней**</u> от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договора купли-продажи в течение <u>**10 (десяти) календарных дней**</u> с момента его подписания. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 05.03.2020 г. № 44 (29158). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

### по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в агрогородке Юрьево, деревнях Каменка, Избицкое, Хотеново Усяжского сельского исполнительного комитета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | **21 мая 2020 в 15.00, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10 Усяжский сельисполком, кабинет председателя** |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Усяжский сельский исполнительный комитет, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 – земельный участок площадью 0,1500 га в дер. Каменка, ул. Новая (участок № 3, объект № 45/2016) № 624885603101000187.<br>Лот № 2 – земельный участок площадью 0,1500 га в дер. Избицкое, ул. Поселочная (участок № 2, объект № 261/2015) № 624885602801000151.<br>Лот № 3 – земельный участок площадью 0,1342 га в аг. Юрьево, ул. Озерная (объект № 130/2016) № 624885610501000301.<br>Лот № 4 – земельный участок площадью 0,1500 га в дер. Хотеново, ул. Садовая (объект № 257/2015) № 624885606901000090 |
| 5 | **Условия продажи** | а) без изменения целевого назначения земельных участков;<br>б) продажа по цене не ниже начальной;<br>в) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики, или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательством Республики Беларусь;<br>г) при подаче заявления на определенный лот только одним участником земельный участок продается по начальной цене, увеличенной на 5 %;<br>д) наличие не менее двух участников |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена** | Лот № 1 – 10 000 руб.<br>Лот № 2 – 12 000 руб.<br>Лот № 3 – 8 000 руб.<br>Лот № 4 – 8 000 руб. |
| 8 | **Условия аукциона** | - продажа по цене не ниже начальной;<br>- участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | Возможность подключения к водоснабжению – лот № 2<br>Возможность подключения к газоснабжению – лот № 2, 3, 4 |
| 10 | **Ограничения в использовании** | Лот № 3 – водоохранная зона рек и водоемов<br>Лот № 4 – охранная зона электрических сетей |
| 11 | **Условия оплаты** | Безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона, без предоставления рассрочки |
| 12 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10 % от начальной (стартовой) цены земельного участка **р/с BY49AKBB36410000006276200000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК: AKBBBY2X**, назначение платежа 04901 (с пометкой «задаток за земельный участок»), УНП с/и 600023836 |
| 13 | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками** | Каждая среда в 10.00 |
| 14 | **Начало приема документов** | 4 мая 2020 года в рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 15 | **Окончательный срок приема документов** | 15 мая 2020 года в 17.00 |
| 16 | **Контактные телефоны** | 8 (01776) 67-131, 67-288, 8 033 902 71 49 |

Расходы по организации и проведению аукциона: лот № 1 – 1 364 руб. 03 коп., лот № 2 – 1 451 руб. 19 коп., лот № 3 – 1 548 руб. 78 коп., лот № 4 – 1 565 руб. 54 коп. и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

**Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».**

<u>Примечания:</u> для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае если интересы покупателя представляет это лицо).

SEX=БАЛЯСЫ

# «ЗАСВЕТЫ» З СЕЦІВА

**Дзе і дагэтуль было жыццё?! Правільна, у інтэрнэце! А цяпер дык і ўвогуле ніякіх сумненняў на гэты конт няма. Усе там, на яго прасторах, забаўляемся, як можам. («У анлайн зайшоў я паглядзець, ці заходзіць у анлайн яна, каб паглядзець, ці сяджу ў анлайне я!») І хочам жа, каб было як мага лепш, але, бывае, сітуацыя выходзіць з-пад кантролю. Хто з чым у сеціве «засвяціўся»? Пагаворым як пра новыя выпадкі «гарачанькага» і пікантнага, так і прыгадаем у тэму сёе-тое з ранейшага. Пачнём з бяскрыўднага прыкладу. Гімнастка, алімпійская чэмпіёнка з ЗША Сімона Байлз выклала відэа, на якім яна здымае з сябе штаны вельмі незвычайным спосабам. Ролік пaглядзелі больш за 14 мільёнаў разоў. Паўтарыць трук змогуць вельмі нямногія. («Правяла сорак хвілін на велатрэнажоры. Адчуванні — супер! Наступным разам паспрабую круціць педалі...») Выканала яго дзяўчына менш чым за паўтары хвіліны: зрабіла стойку на руках і па чарзе нагамі сцягнула калашыны. Не хвалюйцеся, сподняе на гімнастцы было, яна ж іншае дэманстравала.**

У адрозненне ад нашага земляка Сяргея Глушко, вядомага стрыптызёра Тарзана. Таму, відаць, дома стала сумна без работы і ён выклаў хатняе фота ў стылі «ню». Аднак нешта, мабыць, не разлічыў, бо выгляд аголенага мужа Наташы Каралёвай і, у прыватнасці, яго «пятай кропкі» выклікаў не захапленне, а шквал з'едлівых заўваг. («— Назавіце галоўную прычыну, па якой вы разводзіцеся. — Ён не ўмее фатаграфаваць!») У некага нават узнікла асацыяцыя з вядомай балерынай, якая таксама часта выкладвае свае інтымныя фота: «Думала, гэта Валачкова». («Дзіўна, што дагэтуль ні адзін завод па вытворчасці шпагату не прапанаваў Настассі Валачковай стаць яго тварам».) Зграбней жа трэба было, Сярожа, зграбней... Дазволю сабе працытаваць аўтара блога, якая публікуе замест фатаграфій апісанне іх зместу, каб паказаць стэрэатыпнасць дзявочых інстаграмаў, такіх тыповых фітаняшак. «Прыгожа ляжу на борціку басейна. Жыватом уніз, бо асноўная задача — паказаць ягадзіцы. Сакавітыя. Бронзавыя. Гарачыя, хоць бліны на іх пячы. Купальнік гулліва хаваецца ў глыбіні паўпопіяў. Апошняе месца, дзе яго бачылі, — копчык. Прымусіла Валеру зрабіць сорак фота. Выбрала найлепшае. А што ён хацеў? Гэта вайна!» Вось гэта стыль, я разумею!

Ну дык Тарзан хоць за справу пацярпеў. («— Доктар, я эксгібіцыяніст! — Бачу...») Дзяўчына з Мінска ўвогуле «адгрэбла» ні за што. Яна выкладвае ў сваіх профілях прыгожыя і пікантныя здымкі. Звычайна падпісчыкі ўспрымалі іх станоўча, але гэтым разам нешта пайшло не па плане. Дзяўчына ў карункавым хатнім камплекце змясціла ў «Твітары» фота з кухні. І ведаеце, што адбылося? Прыгажуню на здымку фактычна ніхто не заўважыў! Многіх карыстальнікаў найперш зацікавіла, хто ж так робіць — побач з халадзільнікам ставіць пліту! Тым больш усутычную! Спачатку гэта выглядала як жарт, але пакрысе падобных каментарыяў станавілася ўсё больш. «Нельга так блізка пліту да халадзільніка ставіць...» Дзяўчына не вытрымала: «Колькі чалавек мне пра гэта напіша??? 100? 200?» («Як раз'юшыць жанчыну. Пункт першы: хутчэй за ўсё, ты яе ўжо раз'юшыў».)

Не зразумелі карыстальнікі сацыяльных сетак і роліка з вялікімі ягадзіцамі дзяўчыны на банкеце. На кадрах стройная брунетка з пышнымі формамі ў цеснай сукенцы павольна рухаецца пад музыку. Камера здымае дзяўчыну ў профіль, з такога ракурсу яе грудзі і «пятая кропка» відаць асабліва добра, што і абурыла многіх у сеціве. («Хлапцоў так многа халастых, а лайкаюць жанатыя».) Яны палічылі, што дзяўчына выклала відэа не для таго, каб паказаць танец, а каб прадэманстраваць фігуру. («Вясёлы сурдаперакладчык падчас навін не-не ды і расказа пошлы анекдот».) «Непрыстойна надзяваць такія сукенкі», «На танец нават не звярнуў увагу, адразу кінуліся ў вочы яе формы. Нядобра так рабіць. Што за самалюбаванне?» — пісалі каментатары. («Была сёння ў псіхолага. Расказала яму пра сваё жыццё... Плакаў. Ледзьве супакоіла...»)



Яшчэ больш не пашчасціла дзяўчыне Эле Марцін з Каліфорніі, якая адправіла маці фота новага пакоя, але пракалолася на адной «дробязі». Жанчына, хвалюючыся за дачку, папрасіла адправіць ёй здымак жылля, куды тая незадоўга да гэтага пераехала. Гераіня гісторыі просьбу выканала, прычым можна было ўбачыць, што ў пакоі светла і прыбрана. Але... Уважлівая маці, відавочна, ведала, куды глядзець найперш. Яна заўважыла на ўзгалоўі ложка пару наручнікаў і напісала: пакой мілы, але што ў ім робяць аксесуары для БДСМ? («— Ты апошнім часам моцна змяніўся. — Змянілася. — Нават так?!») Дзяўчына мусіла «зваліць» усё на суседзяў па кватэры — маўляў, Джордан здымаў кароткаметражку і папрасіў дапамогі. Усё, карацей, дзеля мастацтва, проста потым наручнікі забыліся прыбраць. («— Дарагая, гэта не тое, што ты падумала! — Ах ты дрэнь! Я так і ведала, што ты сам умееш прасаваць кашулі!») Маці ў гэтую «казку» не паверыла, ды і падпісчыкі пасмяяліся з Элы: «Ну што, затое віншуем з бурлівым асабістым жыццём». Пракол для дзяўчыны быў не самы прыемны, але ён прынёс ёй больш за сто тысяч лайкаў. Чаго не зробіш дзеля папулярнасці ў інтэрнэце? («Я сёння такі дзёрзкі! Было б манту — намачыў бы!»)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Мне важна, каб былі муза і стымул»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— На кастынгу ў Тэатры эстрады вы выконвалі аўтарскую песню «Астываю» (гісторыя пра мінулае каханне). Скажыце, з узростам ваша стаўленне да гэтага пачуцця і да дзяўчат змянілася?***

— Ведаеце, я вельмі лёгка магу закахацца. У гэтым мая праблема, бо мне патрэбныя эмоцыі і натхненне. З узростам знайсці свайго чалавека становіцца ўсё цяжэй, бо твае патрабаванні да іншага растуць. Таму лічу, што жаніцца ў 20-23 прасцей, чым потым. Безумоўна, заўсёды ёсць рызыка, што, можа, і не складзецца, калі кідаешся ў сямейнае жыццё па вялікім каханні... Як чалавек творчы, адсоўваю гэтыя думкі, — хочацца сапраўдных моцных пачуццяў, бо толькі маючы такое каханне, я змагу натхняцца і рухацца наперад. Мне важна, каб былі муза і стымул. Раней мог быць нейкі вобраз дзяўчыны, у якую магу закахацца, а цяпер галоўнае — харызма чалавека і «хімія», што ўзнікае паміж вамі. Бывае, дастаткова пагляду, і ты разумееш: вось мой чалавек. Аднак часцей спачатку загараешся, а потым расчароўваешся...





***— Давайце вернемся ў 2016 год, калі вы перамаглі на «Славянскім базары». Верагодна, акрамя грашовай прэміі атрымалі таксама пазнавальнасць, прапановы аб супрацоўніцтве. Чым быў абумоўлены ваш выхад з прадзюсарскага цэнтра «СПАМАШ»?***

— Гэта адбылося месяцы, мабыць, праз тры пасля «Славянскага базару». Разумееце, кожны прадзюсарскі цэнтр — той асярodак, дзе артыст развіваецца разам са сваёй камандай. І проста ў нейкі момант я адчуў, што мы розныя. На той час я выйграў, хоць у «СПАМАШы» наш заснавальнік Аляксандр Шакуцін шчыра імкнуўся дапамагчы кожнаму з артыстаў. Выдзяляліся грошы для рэпертуару, для ўдзелу ў нейкіх конкурсах. Але калі ты ловіш сябе на думцы, што больш не гарыш тым, што робіш, то разумееш — намінальнае існаванне нікому не патрэбнае... Але ў мяне быў кантракт. Тут чарговы адбор на «Славянскі базар». Я самастойна падаю заяўку на яго і праходжу. Пасля аб'яўлення вынікаў у «СПАМАШы» абрадаваліся. І вось падчас падрыхтоўкі да конкурсу, калі па ініцыятыве заснавальніка маім піяр-менеджарам стаў Сяргей Андрыянаў, і мы з ім сабралі каманду, дзе працавалі Леанід Шырын, Людміла Куц, Дзіна Тыцюк, Дзмітрый Забалотны, я зноў захапіўся працэсам настолькі, што кожны дзень адчуваў, як станаўлюся лепшы. А пасля перамогі пачалі падрыхтоўку да «Еўрабачання». І калі Белтэлерадыёкампанія даслала ў прадзюсарскі цэнтр ліст за подпісам тагачаснага яе старшыні Генадзя Давыдзькі, што мая кандыдатура, як прадстаўніка краіны на гэтым конкурсе, узгоднена без адборачнага тура, а «СПАМАШ», не паведаміўшы мне, проста адмовіўся ад прапановы, то ўзніклі пытанні, на якія я не змог атрымаць адказаў. Гэта стала штуршком напісаць заяву «па ўласным жаданні». Яе падпісалі, што крыўдна, нават без ніякіх пытанняў, хоць у нас былі сумесныя планы, ідэі ды шмат работы, за якую я ўдзячны. Мне такая пазіцыя была абсалютна незразумелая.

***— Сёлета вы зноў былі сярод удзельнікаў адбору на «Еўрабачанне»...***

— У гэтай гісторыі мяне матывуе наяўнасць пляцоўкі, дзе артысты могуць заявіць пра сябе, добрая магчымасць для самарэкламы. Адбор на «Еўрабачанне» — тое месца, дзе яны могуць сябе паказаць. Цяпер і на прасторах інтэрнэту з'явіліся такія магчымасці, але там часта можна застацца падманутым. У любым выпадку, каб займацца музыкай, неабходныя грошы для яе прасоўвання. Разам з тым музычны рынак перанасычаны, і аўдыторыі патрэбны час, каб навучыцца слухаць і адбіраць вартых.

***— У вас ёсць загартоўка спартам, траўмамі, сцэнай... Ці існуюць нейкія страхі цяпер?***

— Мне страшна не рэалізаваць сябе на сто працэнтаў. Паколькі ты камандны гулец і залежыш ад іншых людзей, то часам разумееш, што не заўсёды на максімуме задзейнічаеш свае рэсурсы. Тут і эмацыянальнасць, і нейкія жыццёвыя нюансы адбіваюцца. Але не хочацца, каб гэта было апраўданнем. Трэба браць і дзейнічаць. Яшчэ хочацца запаволіць бег часу. І добра было б менш сумнявацца ў тым, што ствараеш. Як сказаў мне нядаўна адзін калега: пішы — з дзесяці песень хоць адна ды выйдзе. І, можа, сапраўды, калі б ствараў дзясяткі трэкаў у год, то працэй бы ўспрымаў адмовы ці немагчымасць быць пачутым. Таму цяпер паспрабуем дзейнічаць з камандай менавіта такім чынам...

Я не кіруюся патрабаваннямі, якія дыктуе нам грамадства. Лічу, што не варта жаніцца і нараджаць дзяцей, проста таму, што ты «павінны». Жывіце па закліку сэрца. Сустрэну я свайго чалавека, будуць у нас дзеці — цудоўна! Усё патрабуе праверкі часам — і творчасць, і каханне. А яшчэ кожны сам павінен набіць свае гузакі, бо так напрацоўваецца жыццёвы досціп.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з архіва героя.**

***Поўны тэкст інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by***

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 06.05.2020 г.

# ПРА ЗЕМЛЯКОЎ-ПАРТЫЗАН

**Гэты фотаздымак, зроблены днямі на занятках у Малагарадзячыцкай сярэдняй школе Любанскага раёна, нам даслалі чытачы. За некалькі кіламетраў ад гэтых мясцін у гады Вялікай Айчыннай вайны народныя мсціўцы друкавалі газету «Звязда», рабілі свой унёсак у агульнанародную барацьбу супраць захопнікаў.**



Настаўнік Анатоль ВЯЛІЧКА вядомы ў родных мясцінах як краязнавец, даследчык гісторыі партызанскага руху. Ён перадае сваім вучням захаваныя ў народнай памяці звесткі пра жыццё партызан, знаёміць з гісторыяй беларускіх газет і часопісаў, якія ў гады ваеннага ліхалецця прыраўнялі пяро да зброі.

Дзякуючы мясцовым аматарам-краязнаўцам у Любанскім раёне створана і дагледаецца шмат помнікаў барацьбітам за свабоду і незалежнасць Беларусі. У лясной зоне дзейнічае мемарыяльны комплекс, дзе можна ўбачыць партызанскі аэрадром, зямлянкі. Пра тое, як тут выпускалі газету «Звязда», нагадваюць экспанаты раённага музея народнай славы.

**Яўген ПЯСЕЦКІ,**
**фота аўтара.**

# Малітвамі бацькоў, хроснай маці і франтавой удачай

***(Заканчэнне.***
***Пачатак на 1-й стар.)***

Дзеці і ўнукі — яго галоўная нагода для гонару. Жонкі Алены Станіславаўны ўжо больш за дзесяць гадоў няма. З ёй яны выраслілі двух цудоўных дачок. Дзяўчаты скончылі розныя факультэты БДУ, сталі добрымі спецыялістамі ў сваіх галінах, аселі ў сталіцы, выгадавалі і выхоўвалі ўласных дзяцей. Цяпер унук ветэрана працуе ў Мінску, а ўнучка жыве і працуе ў ЗША. Але кожныя выхадныя яна абавязкова выходзіць на сувязь з Каменюкамі і размаўляе з дзядулем па «Скайпе». І кожнае лета прылятае ў Мінск, прыязджае да дзеда ў пушчу. Цяпер усё толькі невядома, як складуцца абставіны ў сувязі з гэтай сусветнай навалай. Але Вадзім Рыгоравіч спадзяецца, што ўсё неўзабаве наладзіцца і ўсе родныя зноў збяруцца ў яго ўтульным доме.

А вайна не забываецца, помніцца — не столькі падзеямі, колькі ўражаннямі, лічбамі, гарадамі. Памяць чалавека — наогул рэч унікальная... На фронт яго прызвалі ў 1944 годзе, адразу пасля вызвалення Пружан. Вадзіму тады толькі споўнілася 18 гадоў. Ваяваў у пяхоце. Ветэран згадвае польскія гарады, якія вызвалялі: Торунь, Быдгашч, Гданьск. Потым фарсіравалі Одэр. Закончыў вайну пад нямецкім горадам Росток. «Страты неслі неймаверныя, — кажа былы салдат. — Дывізія ішла спачатку ў бок Берліна, потым нас павярнулі на поўнач, насустрач танкавай групоўцы. Каля 600 танкаў трэба было знішчыць, каб яны не сталі на шляху нашых наступальных часцей. Гэта, вядома, работа артылерыстаў. Мы ў асноўным падносілі снарады... У пяхоце на перадавой складана выжыць, мала каму шанцавала, — працягвае франтавік. — Уяўляеце, я перажыў пяць папаўненняў! Ідзе ў бой рота — прыкладна 250 чалавек. Пасля бою ў страі застаецца 40—50 байцоў. Рота атрымлівае новае папаўненне. Зноў у бой, і зноў тая ж карціна. І так пяць разоў». Усё жыццё ён лічыў 9 мая сваім галоўным святам. «Нас падняла ў чатыры гадзіны раніцы, думалі, па трывозе, — успамінае Вадзім Рыгоравіч. — А камандзір пастроіў і аб'явіў: перамога. Выскоквалі на вуліцу і палілі ўверх нібы ашалелыя, колькі было патронаў. Тады не ведалі, што давядзецца служыць яшчэ доўга — мне, напрыклад, аж чатыры гады. Але ж канец вайны азначаў жыццё».

Цяпер у яго ёсць час асэнсоўваць, разважаць над тым, што яго ўратавала, у чым крыніца яго шанцавання, чаму ў ліку нямногіх таварышаў-пехацінцаў ацалеў. Можа малітвы бацькоў і хроснай маці дапамаглі? Відаць, усё разам. Бацька Вадзіма быў ганчар, спяваў у царкоўным хоры. А кіраваў тады хорам у Пружанах вядомы музыкант і кампазітар Рыгор Шырма. Сем'і падтрымлівалі сяброўскія адносіны. Жонка Рыгора Раманавіча Клаўдзія Іванаўна стала хроснай маці Вадзіма. Ужо пазней, калі Вадзім Сіняк вучыўся ў Мінску, ён даволі часта наведваў сям'ю Шырмаў, яны падтрымлівалі студэнта.

Дарэчы, пасля ад'езду Рыгора Шырмы з Пружан у Вільню кіраваць царкоўным хорам стаў Рыгор Сіняк, бацька Вадзіма. А ў 1942 годзе наогул атрымаў сан святара. Потым гэты радок з біяграфіі не раз прыпаміналі сыну, калі гаворка заходзіла пра магчымую прыступку ў кар'еры. Часам нават зважалі, што пружанскі святар усю вайну быў сувязным партызанскага атрада. Але Вадзім Рыгоравіч ні аб чым не шкадуе, ганарыцца сваімі бацькамі, сваёй сям'ёй.

Ён згадвае, што ў вайну перасьлед святароў і веруючых часова спыніўся. На вайне наогул было нямнога атэістаў. І пасля вызвалення ён на свае вочы бачыў, як старшыя афіцэры Чырвонай Арміі заходзілі ў пружанскую царкву, не баяліся перахрысціцца, ставілі свечкі, шапталі словы малітваў, а можа, дзякавалі за тое, што засталіся жывыя. Палітыку ганенняў аднавілі пры Хрушчове. Колькі храмаў тады разбурылі, нават крыжы ў вёсках зносілі! Усялякія часы давялося перажыць, але заўсёды імкнуўся жыць па праўдзе і справядлівасці. Нярэдка наказваў ворагаў, ды прынцыпам сваім не здраджваў ніколі, згадвае былы франтавік.

З арміі ён вярнуўся толькі ў 1949 годзе. Яшчэ чатыры гады адслужыў сувязістам у адной з часцей, што дыслацыраваліся ў Германіі. Паступіў у інстытут лясной прамысловасці, паспяхова яго скончыў, атрымаў накіраванне на адзін з заводаў пад Пінскам. Праз пэўны час Вадзім ужо працаваў на пасадзе галоўнага інжынера. І не змірыўся са становішчам, калі на вачах рабочых і спецыялістаў група прайдзісветаў займалася крадзяжамі прадукцыі. Узначальваў зладзеяў дырэктар, разам з двума падзельнікамі яны прадавалі «налева» фанеру, а выручку дзялілі. Малады інжынер паведаміў пра махінацыі ў райкам партыі, прыслалі рэвізію. Нястачу ўскрылі, вінаватых прымусілі ўнесці грошы. Як цяпер сказалі б, раскрылі карупцыйную схему. Але ў дырэктара быў знаёмец у райкаме. З яго дапамогай вырашылі на ўсялякі выпадак пазбавіцца ад занадта прынцыповага спецыяліста. Вось тады і паднялі паперы з біяграфіяй, згадалі бацьку-святара. Давялося сыну шукаць сведак партызанскага мінулага бацькі. Адным словам, нервы патрапалі.

З часам Вадзім Сіняк стаў прыглядваць месца работы бліжэй да родных мясцін. На ружанскую мэблевую фабрыку запрасілі галоўным інжынерам — пагадзіўся адразу, гэта ж побач з Пружанамі. А калі прыехаў, сталі праглядаць дакументы, высветлілася, што не член партыі. Папрасілі прабачэння: гэтая пасада — наменклатура райкама. Тады Вадзім Рыгоравіч уладкаваўся ў лясную гаспадарку Белавежскай пушчы. Як аказалася, асеў у Каменюках назаўсёды. З пачатку 60-х гадоў да выхаду на пенсію працоўнае жыццё ветэрана было звязана з ляснымі ўгоддзямі Нацыянальнага парку. Праўда, раней гаспадарчы аб'ект не так называўся. І кіраўнікі ў ім траплялiся розныя. Былі і такія, якіх Сіняк сустракаў у Пінску. Прынцыповы інжынер ніколі не мірыўся з хапугамі, лайдакамі, прыстасаванцамі. Справа і да звальнення даходзіла. Але начальнікі мяняліся, і высокапрафесійны, да таго ж сумленны работнік зноў аказваўся запатрабаваным. Напрыклад, прыйшоў у пушчу дырэктар Сяргей Балюк і паклікаў Вадзіма Рыгоравіча на адказную работу. А пасля выхаду на пенсію кваліфікаванага інжынера запрасіла працаваць прыватнае дрэваапрацоўчае прадпрыемства. Там ён рабіў яшчэ амаль паўтара дзясятка гадоў.

Сёння дом ветэрана ў Першамайскім завулку, які патанае ў квецені садоў, лёгка адшукаць па таблічцы са звесткамі аб пражыванні ўдзельніка вайны. Яшчэ да нядаўняга часу Вадзім Рыгоравіч часам выпраўляўся ў магазін па пакупкі на веласіпедзе. Цяпер хадзіць стала цяжэй. Дае пра сябе знаць і даўняе раненне ў нагу. Усе клопаты па дамашняй гаспадарцы ўзяла на сябе дачка. А на свята ветэран чакае гасцей. Хоць і нешматлікія па цяперашнім часе, але яны абавязкова прыйдуць павіншаваць, падзякаваць за Перамогу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Камянецкі раён.*

Арт

# САЛЮТ ДЛЯ ГЕРОЯЎ І НАШЧАДКАЎ

**У сталічнай галерэі Леаніда Шчамялёва з 6 мая пачне працаваць выстаўка жывапісу «Салют Радзіме», прысвечаная 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.**

«Тэма мастацкага летапісу Вялікай Айчыннай вайны ў выяўленчым мастацтве Беларусі — асаблівая тэма, якая нікога не можа пакінуць раўнадушным і ніколі не страціць сваёй хвалюючай сілы. З першых дзён вайны мастакі разам з усім народам сталі ў шэрагі абаронцаў сваёй Радзімы. Яны служылі ў розных родах войск, мелі розныя вайсковыя званні і спецыяльнасці, але кожны з іх выконваў цяжкую, небяспечную працу, якую адводзіла яму вайна, — падкрэсліваюць арганізатары выстаўкі. — У творах франтавікоў шчырасць і боль, сапраўднасць пачуццяў выяўленыя ў кожнай рысе, у кожным штрыху, намаляваным, здаецца, не рукой, а агаленым нервам...»




Уласна, да плеяды мастакоў-франтавікоў належыць і Леанід Шчамялёў, які ў снежні 1941-га быў мабілізаваны ва ўзросце 18 гадоў, служыў у пяхоце і кавалерыі, быў цяжка паранены ў баі пад Мазыром, але прайшоў усю вайну і стаў адным з першых мастакоў у СССР, хто паказваў вайну без гераічнага пафасу — такой, якой яе бачыў і запомніў.

На выстаўцы «Салют Радзіме», зладжанай як даніна павагі і ўдзячнасці героям вайны, якія цаной уласнага жыцця разам з усім народам абаранялі родную краіну і перамаглі, прадстаўленыя творы 97-гадовага майстра з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі — «Салют Радзіме», «Ветэран нашага двара», «Акупацыя» і іншыя, а таксама з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея — «Музыканты 1941 года (памяці Георгія Свірыдава)», Беларускага саюза мастакоў — «Генерал Леў Даватар», «Першы дзень міру», калекцыя твораў майстра з Музея гісторыі горада Мінска. Экспазіцыя будзе працаваць да 5 ліпеня.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# Кніжныя навінкі — ад «Мастацкай літаратуры»

**Усе складанасці, якія накладвае пандэмія каранавіруса, тым не менш не з'яўляюцца падставай для спынення кнігавыдавецкай дзейнасці. У красавіку — першай палове мая «Мастацкая літаратура» прапануе чытачу цэлы шэраг цікавых, адметных кніг.**

У перакладзе лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Алеся Марціновіча выходзіць раман заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца «За секунду да выстралу». Таксама неўзабаве з'явіцца зборнік вершаў Уладзіміра Караткевіча «Беларуская песня», якім прадаўжаецца выдавецкая серыя «100 вершаў».

Ужо пабачыў свет зборнік гісторыка-мемарыяльнага характару — «Мы жылі ў будних барацьбы...», у якім сабраны старонкі ваенных дзённікаў беларускіх пісьменнікаў. Гэта нечаканае выданне, у якім многія запісы з'яўляюцца выключна важнымі мастацкімі дакументамі пра Вялікую Айчынную вайну. Юнага чытача, бацькоў, якія лічаць, што кніга не страціла сваіх выхаваўчых задач, безумоўна, прывабіць зборнік з серыі «Дванаццаць месяцаў» — пятая па ліку кніга казак «на кожны дзень». «Колькі ў месяцы дзён — гэтулькі ў кнізе і казак», — такі прынцып складання зборніка. За год выбудуецца сапраўдная казачная бібліятэка.

У Беларусі рэдка выдаюцца мемуары, кнігі, аўтарамі якіх з'яўляюцца палітыкі, высокія дзяржаўныя дзеячы. Таму, відаць, асабліва цікавай здаецца ў гэтай сувязі кніга Аляксандра Радзькова (нагадаем: колішняга міністра адукацыі краіны, першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, старшыні грамадскага аб'яднання «Белая Русь») «Дыскрэтны падыход да назірання жыцця». Серыя, у якой выйшла кніга, — «Люстэрка жыцця». Дарэчы, аўтар — яшчэ і доктар фізіка-матэматычных навук, вядомы ў Беларусі і за яе межамі матэматык. Паверце, кніга «назіранняў жыцця» Аляксандра Радзькова чытаецца на адным дыханні.

А з перакладной мастацкай літаратуры чытача, несумненна, парадуе зборнік вершаў рускага паэта беларускага паходжання магіляўчаніна Валерыя Казакова «Флейта травы». Перакладчыкі яго вершаў на беларускую мову — Янка Лайкоў, Таццяна Сівец, Юлія Алейчанка, Віктар Шніп, Алесь Бадак.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

БЕЛАРУСБАНК

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
## ПО ПРОДАЖЕ КАПИТАЛЬНОГО СТРОЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Минское областное управление № 500 ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | Капитальное строение (гараж) с инвентарным номером 640/С-26194, расположенное по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 31, общей площадью 42,8 кв. м |
| **Начальная цена продажи** | 9162,20 белорусского рубля (девять тысяч сто шестьдесят два рубля двадцать копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 458,11 белорусского рубля (четыреста пятьдесят восемь рублей одиннадцать копеек) |
| **Открытый аукцион состоится** | **Открытый аукцион состоится 11.06.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, комната переговоров** |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | В рабочие дни с 9.00 до 16.30, в пятницу – до 15.45 по 08.06.2020 включительно по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, кабинет 112 |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефону: 8 (017) 279-48-24 |

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 458,11 белорусского рубля на счет № BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

- юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

- иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 20 рабочих дней со дня проведении открытого аукциона.

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | | |
| **Продавец** | **Минское областное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24** | | |
| **Предмет аукциона Месторасположение: Минская обл., Минский р-н** | | | |
| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Лот №1** | | | |
| **Магазин № 4** | 348,1 кв. м | 600/С-132768 | **Михановичский с/с, д. Бордиловка** |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,3767** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина № 4 в д. Бордиловка. Ограничения (обременения) прав: охранная зона линий электропередачи до 1000 вольт, пл. 0,0210 га | | | |
| **Начальная цена лота №1 с НДС 20 % – 180 000,00 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Здание магазина** | 98,7 | 600/С-165553 | **Крупицкий с/с, д. Дедовка, 1А** |
| Составные части и принадлежности: сарай | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0.1334** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений магазина | | | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 31 185,42 бел. руб.** (снижена на 10 %) | | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 08.04.2020 | | | |
| **Аукцион состоится 09.06.2020** в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 08.06.2020** до 17.00 по указанному адресу | | | |

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8044-704-92-06.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ

| |
|---|
